

ШЭКСПІР
І КУПАЛЬСКАЯ
НОЧ
9

ДЗЯЎЧЫНА
ЗА РУЛЁМ
ВЕРТАЛЁТА
12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
4 ЖНІЎНЯ 2018 г. СУБОТА № 148 (28764)

**ЛІЧБА ДНЯ**

**Больш за 3 млн тон**

*збожжа намалацілі беларускія аграры на ўчарашні дзень, паведамляе сайт Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Збожжавыя і зернебабовыя культуры сабраныя з 1,078 млн га, што складае 50,4 % запланаванай плошчы. Усяго па краіне намалочана звыш 3 млн тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 28,4 ц/га. Сёлета масавая ўборка пачалася раней у параўнанні з мінулым годам. У 2017-м па стане на 3 жніўня аграрыі намалацілі 1,268 млн тон збожжа. Па тэмпах работ лідзіруе Брэсцкая вобласць: там сабрана 78 % ад плана. У Гродзенскай вобласці ўбрана 68 % плошчаў, Мінскай — 54,4 %, Гомельскай — 44,8 %, Віцебскай — 3 1 % і Магілёўскай — 26,2 % плошчаў.*

# ЯК СПРАВЫ НА ПОЎНАЧЫ?

**Развіццё Мёршчыны і Віцебскай вобласці ў цэлым ацаніў Аляксандр Лукашэнка**

**Асноўнымі тэмамі паездкі Прэзідэнта сталі ўборачная кампанія і медыцынскае абслугоўванне насельніцтва. Акрамя таго, быў закрануты шэраг сацыяльна-эканамічных пытанняў, у тым ліку стратныя прадпрыемствы і праблема адзінокіх старых.**

Спярша, прыляцеўшы на поле ААТ «Туркова», Аляксандр Лукашэнка падрабязна азнаёміўся са станам уборачнай кампаніі на Віцебшчыне. У структуры землекарыстання Мёрскага раёна сельскагаспадарчыя ўгоддзі гэтай установы займаюць 6 %. Яна з'яўляецца адным з лідараў.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Андрэйчанка адзначыў пэўныя праблемы ў Віцебскай вобласці. У тым ліку звярнуў увагу на кадры і правал з унясеннем мінеральных угнаенняў. А ад гэтага непасрэдна залежыць ураджайнасць. **СТАР. 2**



Фота БелТА.

У новым копрусе Мёрскай бальніцы сёлета ўжо нарадзілася 27 дзетак.

# СТРОІ ДЛЯ ШВАГЕРАК



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Паміж сабою Кацярына КАВАЛЕВІЧ і Марына СУХАРУКАВА — швагеркі. Часта прыязджаюць пагасціць у вёску Пагост Жыткавіцкага раёна да славутай майстрыхі Кацярыны Аляксееўны ПАНЧЭНІ, якая і вышыла маладым жанчынам палеска-тураўскія строі.

**КОРАТКА**

- Рэспубліканскі творчы конкурс на найлепшае асвятленне ў СМІ і на інтэрнэт-рэсурсах тэматыкі ўборачнай кампаніі «Жніво-2018: І хлебам адзіныя» пройдзе па сямі намінацыях.
- **Тралейбусы на акумулятарных батарэях выехалі на маршруты Віцебска.**



- Набор валанцёраў для работы на міжнародным дзіцячым конкурсе песні «Еўрабачанне-2018» прадоўжаны да 25 жніўня.
- **Арол-магільнік зарэгістраваны ў Белавежскай пушчы.**
- У Беларусі ў ліпені ападкаў выпала на 75 % больш за кліматычную норму.

ISSN 1990 - 763X
18148
9 771990 763008

■ Выпрабавана на сабе

# ЯК «ЗВЯЗДОЎКА» АРХЕОЛАГАМ СТАЛА,

## капала сярэднявечныя магілкі і варыла кашу ў вядры

**Інфармацыя пра знойдзеныя на раскопках пад вёскай Кульнева ў Расонскім раёне магілкі XVI стагоддзя абляцела на днях ледзьве не ўсе СМІ. Аднак яшчэ паўтара тыдня таму назад, калі археолагі адкапалі першыя чатыры шкілеты, былі сумненні, ці так гэта. Меркавалася, што гэта ўсё ж абаронцы цытадэлі Сокал, якую ўжо трэці год даследуюць валанцёры Полацкага археалагічнага легіёна (ПАЛа), створанага 20 гадоў таму гісторыкам Маратам Клімавым. Адкуль я пра гэта ведаю? Адтуль, што чатыры дні правяла на раскопках у гэтай унікальнай у многіх сэнсах суполцы энтузіястаў і ведаю, як жывецца археолагам у экспедыцыі.** **СТАР. 5**



# ЯК СПРАВЫ НА ПОЎНАЧЫ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Тым не менш спікер сказаў, што ёсць і вельмі добрыя палі. У цэлым прагназуецца, што вобласць дасягне паказчыка мінулага года. Пакуль што арыентуюцца намалацiць 1 млн тон збожжа

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што не трэба падлічваць на бюджэтную дапамогу для закупкі мінеральных угнаенняў, неабходна шукаць выхад у севазвароце і выкарыстанні арганікі. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Сеяць неабходна ўсе культуры ў раёне. Але асноўныя — працэнтаў 85—90 — так, як нам прырода падказвае». Кожны раён, на думку Прэзідэнта, павінен вызначыцца, сыходзячы з кліматычных умоў і чалавечага вопыту. Аляксандр Лукашэнка неаднаразова падкрэсліў, што самае галоўнае — дысцыпліна, працоўная і тэхналагічная: «Людзі павінны выконваць свае абавязкі».

На сёння ў вобласці ўбралі каля 30 % збожжа. Мікалай Шарснёў, старшыня Віцебскага аблвыканкама, пракаментаваў для журналістаў, што не так даўно аблятаў вобласць і месцамі ёсць некаторыя праблемы з пераўвільгатненнем. Ён адзначыў, што палі на ўсходзе больш перспектыўныя.

Кіраўніку дзяржавы было далажана пра нарыхтоўку кармоў. Прэзідэнт пацікавіўся вытворчасцю прэсаў і сказаў, што зімой правераць гэты кірунак. Ён акцэнтаваў увагу, што неабходна выраблядь айчынныя.

Што датычыцца эканамічнага развіцця рэгіёна, за першую палову 2018-га тут скарацілася колькасць стратных арганізацый. Пад увагай знаходзіцца і структура даўгоў у АПК. Рабочая група выпрацавала адзінае рашэнне, якое прадугледжвае стварэнне холдынга і рэвізію даўгоў прадпрыемстваў.

Ацаніўшы работу на палях, Аляксандр Лукашэнка накіраваўся ў Мёрскую цэнтральную раённую бальніцу. На пачатку мая гэтага года быў уведзены ў работу яе новы корпус. У ім і нарадзілася ўжо 27 дзетак. Прэзідэнту паказалі акушэрскае аддзяленне і палаты, дзе ляжаць жанчыны. Прыезд у медустанову стаў нагодай абмеркаваць і больш шырокае кола пытанняў, у тым ліку медабслугоўванне людзей на вёсцы і дапамогу адзінокім пажылым людзям.

Кіраўніка дзяржавы праінфармавалі, што ў Мёрах збіраюцца пабудаваць міжраённы медыцынскі цэнтр. Плануецца, што ён будзе абслугоўваць жыхароў шасці раёнаў Віцебскай вобласці, а таксама працаваць на экспарт паслуг. Ён будзе функцыянаваць па прынцыпе дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Гэта камерцыйны праект, ім займаюцца інвестары, якія будуюць завод металапракату ў горадзе. То-бок у тым ліку забяспечваецца падрыхтоўка інфраструктуры для супрацоўнікаў, якія пераедуць у Мёры.

Прэзідэнт выказаў меркаванне, што дзяржава змоджа аплачваць у гэтай установе пэўныя паслугі насельніцтву, але неабходна, каб кошт адпавядаў сярэдняму па краіне. Больш канкрэтна можна будзе размаўляць, калі з'явяцца прапановы.

### Каментарый у тэму

**Міністр аховы здароўя Валерый МАЛАШКА:**

— Адкрыццё гэтага лячэбнага корпуса — падзея і для Мёрскага раёна, і для жыхароў Віцебскай вобласці. І, вядома, гэта новы вызначаны стандарт аказання медыцынскай дапамогі сельскаму насельніцтву. Таму што на гэтым узроўні мы сканцэнтравалі ўсё неабходнае дыягнастычнае, лячэбнае абсталяванне і медыцынскія кадры для таго, каб можна было аказаць медыцынскую дапамогу пры любым клінічным стане, не чакаючы брыгады з Віцебска ці Мінска, рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтраў. Дапамога патрэбна ў неадкладных станах тут і зараз, таму мы і гаворым пра новы стандарт. Ён у многім забяспечаны абсталяваннем, якое зроблена прадпрыемствамі нашай краіны.

Мы шмат у чым павінны мяняць твар пярвічнай дапамогі. І сёння Прэзідэнт узгадніў змяненне ў сацыяльным стандарце ў плане ўкаранення інстытута ўрача агульнай практыкі. Ён будзе прадугледжваць не толькі змяненне найменя ўрача-спецыяліста. У першую чаргу гэта датычыцца нагрузкі на доктара. Гэта зменіць яго каманду: медсястра з новымі кампетэнцыямі, памочнік, які зможа вызваліць урачу час не толькі для хворага пацыента, але і для здаровага.

Таксама сёння мы гаворым пра тое, што змяняем стандарты хуткай медыцынскай дапамогі на сяле. У той частцы, што раней прадугледжвалася адна брыгада на 12 тысяч насельніцтва.

**Надзея АНІСОВІЧ,**
*Мёрскі раён.*

## Вінш уем!

# Прызнанне ад парламента

Малады журналіст газеты «Звязда» Вераніка Пуставіт узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь за значны ўклад у асвятленне дзейнасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, пытанняў фарміравання і рэалізацыі сацыяльнай і эканамічнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Грамату парламенцкаму карэспандэнту ўручылі намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар Сірэнка і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Панцюхоў. У цырымоніі ўзнагароджання ўдзельнічаў начальнік Сакратарыята Савета Рэспублікі Аляксандр Слабадчук.

Рэдакцыя «Звязды» віншуе калежанку! Зычым ёй далейшых поспехаў у рабоце, творчых знаходак, натхнення і прызнання!

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Латвіі зафіксавана буйная ўспышка АЧС

Здарэнне зарэгістравана на ферме Druvas Unguri, на якой гадуецца больш за 15 тысяч жывёл.

Гэта самая буйная ўспышка захворвання з тых часоў, як АЧС была ўпершыню зарэгістраваная ў краіне ў 2014 годзе, паведамляе BNS. У сувязі з гэтым урад Латвіі 3 жніўня правёў пазачарговае пасяджэнне, на якім абмяркоўваліся меры па недапушчэнні распаўсюджвання хваробы.

Зараз работа фермы Druvas Unguri спыненая, распачата расследаванне. Устаноўлены ахоўная зона ў радыусе трох кіламетраў ад фермы і зона нагляду ў радыусе дзесяці кіламетраў. Асаблівая ўвага ўдзяляецца перавозы свіней і мясных прадуктаў.

### У Францыі ўвялі штраф за непрыстойнасці на адрас жанчын

Французскі парламент ухваліў закон аб увядзенні штрафу за непрыстойнасці на адрас жанчын. Пра гэта ў эфіры радыёстанцыі Europe 1 паведаміла дзяржаўны сакратар па пытаннях роўнасці паміж мужчынамі і жанчынамі Марлен Ш'япа.

Паводле яе слоў, у адпаведнасці з новым законам за дамаганні на вуліцы, у тым ліку вуснья, будзе прызначацца штраф у памеры ад €90 да €750. «Раней вулічныя дамаганні заставаліся беспакаранымі, з гэтага моманту ўсё зменіцца», — заявіла Ш'япа.

Як адзначыла чыноўніца, новыя меры былі прынятыя ў адказ на інцыдэнт, які адбыўся на мінулым тыдні ў Парыжы. Там маладую дзяўчыну ўдарылі пасля таго, як яна папрасіла змоўкнуць мужчыну на вуліцы, які свіснуў ёй услед.

Праціўнікі закона лічаць, што ён пакладзе канец «культуры заляцання» да дзяўчат. Аднак, як падкрэсліла Ш'япа, «неабходна ўстанавіць дакладную сацыяльную забарону» і «спыніць эскалацыю канфлікту з самага пачатку».

### Дадон заявіў, што больш не будзе мірыцца з блакіраваннем сваіх паўнамоцтваў



Прэзідэнт Малдовы Ігар Дадон заявіў у інтэрв'ю мясцоваму тэлеканалу Accent, што ні ён, ні партыя сацыялістаў больш не стане мірыцца са сваім адхіленнем ад рычагоў улады.

«Калі пасля парламенцкіх выбараў у нас не будзе магчымасці ўплываць на ўнутраную палітыку, тады ў мяне, як у прэзідэнта, два варыянты. Першы — я выводжу людзей на плошчу, і ўсімі магчымымі спосабамі мы робім так, каб памяняць сітуацыю, не пытайце мяне, як менавіта. Альбо ставім пытанне рубам: прэзідэнцкая форма праўлення. Не згодныя — тады пункт нумар адзін, іншых варыянтаў няма», — сказаў прэзідэнт.

«Калі яны (дэмакратычная партыя, якая кантралюе парламент) думаюць, што «нагнуць» левых і правых і створаць сабе пасля выбараў камфортную сітуацыю для праўлення ў кааліцыі, такога не будзе. Вы ўбачыце іншага прэзідэнта. Я не хачу ўвайсці ў гісторыю як прэзідэнт, які ніяк не змог паўплываць на сітуацыю ў краіне», — заявіў малдаўскі лідар.

Наступныя парламенцкія выбары ў Малдове прызначаны на 24 лютага 2019 года.

## Жніво-2018

# АГРАРЫІ ПЛАНУЮЦЬ САБРАЦЬ КАЛЯ 7 МЛН ТОН ЗБОЖЖА

### У паўднёвых раёнах хутка будуць завяршаць уборку, а ў паўночных толькі пачалі

**Каля 7 млн тон збожжа плануюць сабраць з палёў беларускія аграрыі. Пра гэта паведаміў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення раслінаводства Мінсельгасхарча Васіль ЯДЛОЎСКІ.**

Па яго словах, у свірнавай вазе сёлета чакаецца, што аграрыі збяруць каля 7 млн тон збожжа разам з кукурузай. Пры гэтым на харчовыя мэты ў краіне трэба толькі 850 тысяч тон збожжавых і зернебабовых культур. Асноўны аб'ём збожжа ў 5 млн тон пойдзе на фуражныя мэты.

Па ацэнцы спецыялістаў, бягучая ўборачная кампанія характарызуецца апераджальным развіццём сельгаскультур на фоне высокіх тэмператур.

Таму да ўборкі збожжавых прыйшлося прыступіць раней. «Сельгаскультуры ў перыяд росту адчувалі востры недахоп вільгаці, з-за чаго не набіралі планаваную масу і ўраджайнасць. Таму ў нас назіраецца некаторы недабор збожжа. Але прагназуемы ўраджай забяспечыць выкананне дзяржзаказу, патрэбнасці ў харчовым збожжы, патрэбы перапрацоўшчыкаў і жывёлагадоўлі», — запэўніў Васіль Ядлоўскі.

У сваю чаргу **намеснік старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага аблвыканкама Сяргей ПРЫМАЧЭНКА** адзначыў, што ў сталічным раёне ўжо ўбралі збожжавыя больш чым на 50 % плошчаў.

«У дзень мы ўбіраем больш за 5 % плошчаў. На сёння ў Мінскай вобласці намалочана 778 тысяч тон збожжавых. У найбліжэйшы час атрымаем першы мільён тон. На жаль, з-за ўмоў надвор'я ўраджай будзе меншы за леташні. Наша задача — атрымаць не менш за 2 млн тон збожжа разам з кукурузай», — паведаміў Сяргей Прымачэнка.

Разам з тым зараз тэрытарыяльна ўборка ўраджаю кардынальна адрозніваецца. Аграрыям даводзіцца падладжвацца пад змены ўмоў надвор'я. Так у паўднёвых раёнах Міншчыны ўжо ўбралі ад 60 % да 80 % плошчаў збожжавых: у Салігорскім — амаль 75 %, у Нясвіжскім — 82 %, у Старадарожскім і ў Любанскім — больш за 80 %. У сваю чаргу ў паўночных раёнах толькі пераходзяць да актыўнай стадыі ўборкі: у Барысаўскім убралі 22 % плошчаў збожжавых, у Мядзельскім — 24 %.

Таксама вядома, што з паўднёвых раёнаў плануецца накіраваць на дапамогу паўночным больш за 60 камбайнаў. Пры неабходнасці будзе накіравана яшчэ каля 100 камбайнаў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

## Класныя навіны

# Школьная праграма + прафесійныя навыкі

**Старшакласнікі змогуць праходзіць прафпадрыхтоўку ў ССНУ і ВНУ.**

Пастановай Савета Міністраў ад 2 жніўня 2018 года № 575 у Палажэнне аб бесперапынным прафесійным навучанні па прафесіях рабочых уключаны новыя нормы. Яны ўстанаўліваюць магчымасць арганізацыі працоўнага навучання для вучняў 10—11 (12) класаў устаноў агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі праз прафпадрыхтоўку не толькі ў агульнаадукацыйных установах.

У прыватнасці, прадугледжана, што вучні старшых класаў школ і гімназій (ліцэяў) змогуць праходзіць такое навучанне ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, установах дадатковай адукацыі дарослых, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі на аснове дагавораў аб прафпадрыхтоўцы рабочага (служачага) на платнай аснове.

Выдаткі па гэтых дагаворах будуць аплачвацца за кошт бюджэтных сродкаў устаноў агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, прадугледжаных на працоўнае навучанне старшакласнікаў, і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам (даходаў устаноў агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, атрыманых ад пазабюджэтнай дзейнасці — арганізацыі гурткоў на платнай аснове, арэнды памяшканняў).

Як паведамлялася раней, тыпавы вучэбны план на 2018/2019 навучальны год прадугледжвае ўвядзенне ў 10 класе прадмета «Працоўнае навучанне». Раней вывучэнне гэтай дысцыпліны завяршалася ў 9 класе. З 1 верасня ў рамках згаданага вучэбнага прадмета дзесяцікласнікі будуць атрымліваць прафесійныя навыкі, асвойваючы адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) у аб'ёме 6 гадзін у тыдзень.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует **о снятии лота № 1 (помещения, распложенные по адресу: г. Минск, пер. Менделеева 1-й, 50-2/3)** с аукциона по продаже имущества, принадлежащего ООО «Гофробум», назначенного на 15.08.2018 (публикация извещения в газете «Звязда от 14.07.2018 г.)
**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42, www.cpo.by УНП 690696696**

■ Супрацоўніцтва

# ДАКУМЕНТ ДАЕ ВЫНІК

## Зборачная вытворчасць ААТ «Бабруйскаграмаш» запрацавала ў Егіпце



**На днях у Каіры ў рамках семінара-прэзентацыі сельскагаспадарчых машын, якія выробляюць у ААТ «Бабруйскаграмаш», адбыўся запуск зборачнай вытворчасці тэхнікі прадпрыемства, арганізаванага сумесна з егіпецкай кампаніяй Helwan Machinery and Equipment.**

Вытворчасць арганізавана ў сталіцы Егіпта ў рамках рэалізацыі падпісанага ў 2017 годзе Мемарандума аб узаемаразуменні на базе кампаніі Helwan Machinery and Equipment, якая ўваходзіць у Нацыянальную арганізацыю ваеннай прамысловасці.

Семінар-прэзентацыя прайшоў пры ўдзеле пасольства Рэспублікі Беларусь у Егіпце. Прадстаўнікі беларускай і егіпецкай кампаній паказалі пяць машын сумеснай зборкі: касілкі — ротарную КДН-210 і сегментна-пальцавую КСП-2,1, прэс-падборшчыкі рулонныя ПРФ-145 і ПР-60, а таксама машыну для ўнясення цвёрдых арганічных угнаенняў МТТ-9.

Як паведамілі ў ААТ «Бабруйскаграмаш», удзельнікі мерапрыемства зацікавіліся прадстаўленымі ўзорамі тэхнікі. Ужо ў ходзе семінара-прэзентацыі адбыліся перагаворы членаў дэлегацыі беларускай кампаніі з кіраўніцтвам шэрагу егіпецкіх кампаній і арганізацый аб набыцці прапанаванай тэхнікі.

На гэтым работа не спыняецца: пры ўдзеле пасольства Беларусі была арганізавана сустрэча прадстаўнікоў айчыннай арганізацыі з кіраўніцтвам егіпецкай кампаніі па сельскагаспадарчым развіцці. Бакі абмеркавалі перспектывы сумеснай работы па прасоўванні беларускай прадукцыі для патрэб егіпецкіх фермераў у розных рэгіёнах краіны.

Дарэчы, цяпер машыны для аграрнага сектара маркі «Бабруйскаграмаш» працуюць амаль у 50 краінах свету.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ**

■ Фестывалім

# ТАЯМНІЦЫ СТАРАДАЎНІХ РЫЦАРАЎ

**Адкрыюцца ўсім, хто прыедзе заўтра ў старажытны Мсціслаў на славуты Рыцарскі фэст. Святочныя мерапрыемствы пачаліся яшчэ ўчора, але сёння і заўтра адбудуцца самыя галоўныя падзеі.**

Гэта вялікае шэсце рыцарскіх клубаў і творчых калектываў з Беларусі і Расіі, конныя прадстаўленні, сярэднявяковыя забавы, тэатралізаваны штурм замка, экскурсіі па старадаўнім гарадзішчы, вогненныя шоу, канцэрты фольк-груп. Наведвальнікаў чакаюць выстаўкі старажытных даспехаў, агнястрэльнай зброі, інквізітарскіх прылад для катаванняў, мясцовых кладаў.

Мсціслаўскі фэст славіцца сваімі гандлёвымі радамі. Самая шматлюдная і запатрабаваная пляцоўка — «Горад Майстарслаўль» у цэнтральнай частцы горада. Тут будуць не толькі дэманстраваць і прадаваць, але і запрашаць на майстар-класы, гульні, атракцыёны, у кавярні пад адкрытым небам.

Фішка сёлетняга фэсту — квэст-гульні, падчас якіх вам трэба будзе знайсці старадаўні залаты дукат, замоўлены на ўдачу, адчуць сябе прадстаўнікамі старасвецкага роду, разгадаць таямніцы загадкавага рукапісу. Загадкавасці надасць блуканне па падвалах карменіцкага касцёла, пабудаванага ў XVII стагоддзі.

— Сёлета ўпершыню мы дадзім магчымасць паглядзець на горад з вышыні птушынага палёту — пакатаем гасцей на верталёце, — паведаміў **намеснік старшыні райвыканкама Ігар МЕЛЬНІКАЎ.** — Акрамя забаўляльных і відовішчных праграм, будзе магчымасць наведаць нашы шматлікія храмы і пакланіцца мошчам святых, у тым ліку Матронушкі Маскоўскай, Серафіма Сароўскага, Лукі Война-Ясянецкага, Сергія Раданежскага. У кармеліцкім касцёле пройдзе вялікая святочная служба, у якой прыімуць удзел 15 святароў з розных раёнаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

# ТРЫ З ЧАТЫРОХ

### Толькі салігорскі «Шахцёр» не змог працягнуць выступленне ў топ-турніры

**У чацвер адразу тры клубы нашай краіны біліся за выхад у наступны этап Лігі Еўропы. Футбалісты мінскага «Дынама», двойчы перамогшы славацкую «Дунайску Стрэду», выканалі сваю задачу і прайшлі ў 3-ці кваліфікацыйны раўнд.**

Нагадаем, у гасцях тыдзень таму мінчане перамаглі з лікам 3:1, а на сваім полі згулялі яшчэ больш упэўнена. Ураш Нікаліч (дубль), Уладзімір Хвашчынскі і Піліп Іваноў сваімі галамі вырашылі зыход паядынку — 4:1. У наступным раўндзе каманду Сяргея Гурэнкі чакае куды больш моцны і вядомы сапернік — расійскі «Зеніт». Дарэчы, за гульнёй у Мінску ўжо назіраў адзін з прадстаўнікоў трэнерскага штаба піцерскага клуба Анатоль Цімашчук.

Брэсцкае «Дынама» ў Афінах сустрэлася з грэчаскім «Атрамітасам», паядынак атрымаўся даволі драматычны. На працягу ўсяго матча ўладальнікі Кубка Беларусі прайгравалі гаспадарам і толькі на 5-й кампенсаванай хвіліне другога тайма Павел Няхайчык зрабіў лік 1:1. Нагадаем, у першай гульні на сваім полі брастаўчане выйгралі з мінімальнай перавагай 4:3, таму праходзяць далей. Чарговым сапернікам каманды Аляксея Шпілеўскага будзе кіпрскі «Апалон» з Лімасола.

Яшчэ адзін прадстаўнік Беларусі салігорскі «Шахцёр» у Познані сустракаўся з мясцовым «Лехам». Гаспадары адкрылі лік на 15-й хвіліне гульні. У другім тайме Дзяніс Лапцеў аднавіў раўнавагу, і асноўны час завяршыўся ўнічыю 1:1, дарэчы, гэтак жа, як і ў першай гульні ў Салігорску. На старце дадатковага часу Крысціян Гютк'ер другі раз патрапіў у вароты Андрэя Клімовіча, а за дзве хвіліны да фінальнага свістка ён жа аформіў хет-трык — 3:1.

Матчы 3-га кваліфікацыйнага круга пройдуць 9 і 16 жніўня.

Нагадаем, раней футбалісты барысаўскага БАТЭ прабіліся ў 3-ці кваліфікацыйны раўнд Лігі чэмпіёнаў, адолеўшы па суме дзвюх сустрэч фінскі ХІК. У Хельсінкі чэмпіёны Беларусі выйгралі з лікам 2:1, а ў Барысаве згулялі ўнічыю 0:0. У 3-м крузе кваліфікацыі Лігі чэмпіёнаў футбалісты БАТЭ сустрэнуцца з «Карабахам» з Азербайджана.

Такім чынам, тры з чатырох беларускіх клубаў працягваюць удзел у футбольных топ-турнірах.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■ Будзьце пільнымі!

# Рабілі грошы на грашах

**Аб'явы накшталт «пазычу грошы» сёння можна ўбачыць амаль на кожным слупе. Напэўна, такія прапановы: камусьці здаюцца прывабнымі не трэба ісці ў банк, шукаць паручыцеляў. Але не заўсёды такія паслугі аказваюць чыстыя на руку людзі. Пацвярджэннем таму стаў нядаўні факт, выяўлены супрацоўнікамі фінансавай міліцыі.**

— Падчас праверкі на прадмет занятку незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю стала вядома, што 58-гадовы жыхар Быхаўскага раёна разам са сваёй жонкай і маладой сужыцелькай з красавіка 2013-га да лютага 2017 года давалі грамадзянам грошы пад працэнты і потым заманьвалі іх у пастку. Яны прымушалі сваіх кліентаў пісаць распіску, а пасля вяртання доўгу ее не аддавалі і не знішчалі, а, наадварот, пускалі ў справу. Разам са сваімі памочніцамі мужчына звяртаўся ў суды, каб паўторна спагнаць з чалавека грошы, ды яшчэ з працэнтамі, — расказаў падрабязнасці крымінальнай гісторыі **намеснік начальніка ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай вобласці Аляксандр ШАРОЙКІН.**

Падчас следства высветлілася, што паслугамі ліхвяра скарысталіся 33 чалавекі. Прыбытак, які ён атрымаў падманным шляхам, склаў больш за 144 тысячы рублёў. Акрамя гэтага, падчас вобыску на месцы жыхарства арганізатара групы знойдзена халодная зброя часоў Вялікай Айчыннай вайны. Мужчына затрыманы. Магілёўскім міжраённым аддзелам Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь у дачыненні да членаў злачыннай групы распачаты шэраг крымінальных спраў на падставе артыкулаў, звязаных з незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю і махлярствам.

Усіх, хто пацярпеў ад дзеянняў махляроў, просяць звяртацца па тэлефонах: (0222) 41-09-00 (кругласутачна), 41-16-08 (з 9.00 да 18.00).

**У тэму**

**Гэта адна з рэзанансных спраў у сферы эканамічных злачынстваў, якую раскрылі супрацоўнікі УДФР КДК па Магілёўскай вобласці за мінулае паўгоддзе. Але іх нашмат болей.**

Як паведаміў **Аляксандр СКОРЫ, часова выконваючы абавязкі начальніка ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Рэспублікі Беларусь па Магілёўскай вобласці,** за шэсць месяцаў гэтага года ўпраўленнем па выніках праведзеных праверак дадаткова налічана ў бюджэт 19,7 мільёна рублёў, выяўлена 76 злачынстваў, 37 з якіх аднесены да катэгорыі цяжкіх. Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 44 правапарушальнікі, канфіскавана з нелегальнага абароту таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў на агульную суму 6,3 мільёна рублёў, праведзена 708 прафілактычных мерапрыемстваў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## Дзіцячае «Еўрабачанне-2018» паставіла новы рэкорд

**Украіна возьме ўдзел у творчым спаборніцтве, нягледзячы на недафінансаванне.**

На міжнародны дзіцячы песенны конкурс, які адбудзецца ўжо ў лістападзе ў Мінску, заявілася рэкордная колькасць краін-удзельніц — 20! Падобнага не было за ўсю шаснаццацігадовую гісторыю творчага форуму. Прычым Украіна, якая была адмовілася ад удзелу з фінансавых прычын, усё ж вярнулася на конкурс пасля афіцыйнага дэдлайну. Заяўку нашых суседзяў Еўрапейскі вяшчальны саюз і Назіральная рада дзіцячага «Еўрабачання» адобрылі на днях.

Як адзначыў **старшыня Белтэлерадыёкампаніі Іван ЭЙСМАНТ,** які курыруе падрыхтоўку да дзіцячага конкурсу ў якасці генеральнага прадзюсара, гэта «ўдвая прыемная навіна»: «Па-першае, мы рады, што наша паўднёвая суседка возьме ўдзел у конкурсе — там вельмі падрыхтаваныя дзеці, і гэта вялізная глядацкая аўдыторыя, па-другое, мы сталі ўладальнікамі рэкорду дзіцячага «Еўрабачання», сабраўшы заяўкі ад 20 краін».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## Сутыкнуліся два трактары

### Пацярпеў адзін з кіроўцаў

**Здарэнне адбылося ў Дзятлаўскім раёне. У выніку сур'ёзнага дарожна-транспартнага здарэння адзін з механізатараў патрапіў у рэанімацыю.**

Па інфармацыі УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама, ад Дзятлава ў напрамку вёскі Хвінявічы па дарозе рухалася некалькі адзінак сельскагаспадарчай тэхнікі. У нейкі момант механізатар апошняга трактара пайшоў на абгон. У гэты ж час трактар з прэс-падборшчыкам, які рухаўся першы, пачаў паварочваць налева. Механізатар паспрабаваў пазбегнуць сутыкнення, узяўшы налева, аднак гэта не атрымалася. Трактар з прэс-падборшчыкам перакуліўся, яго кіроўца быў дастаўлены ў бальніцу.

## Сясцёр зносіла цячэннем...

**Здарэнне адбылося бліжэй да вечара, калі сяржант унутранай службы Мікіта Грыгор'еў, камандзір аддзялення аварыйна-выратавальнага паста № 11 Наваполацкага гарадскога аддзела МНС, у вольны ад нясення службы час знаходзіўся на гарадскім пляжы ў Полацку.**

Як паведамляе МНС, ратавальнік убачыў, што дзяўчынку школьнага ўзросту зносіць цячэннем, а старэйшая дзяўчына паплыла да яе на дапамогу. З-за моцнай плыні ракі іх аднесла на адлегласць каля 70 метраў ад берага, і яны пачалі тануць.

Работнік МНС забег у ваду і паплыў да іх. Падплыўшы бліжэй, ён убачыў, што адна з дзяўчат выбілася з сіл, трымаецца за другую і іх цягне пад ваду. Адну з дзяўчат ратавальнік узяў пад рукі, другая ўзялася за яго плячо, і яны разам паплылі ў бок берага. Работнік МНС выцягнуў абедзвюх на бяспечную глыбіню, а затым і на бераг ракі.

Выратаваныя — стрыечныя сёстры. Старэйшая — першакурсніца мясцовага каледжа, малодшая — вучаніца 6 класа сярэдняй школы. Пасля агляду брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі дзяўчат адпусцілі дадому.

## «Бакас» упаў у ваду

**Лёгкі самалёт Х-32 «Бакас» упаў у ваду ў Салігорскім раёне. Паветранае судна належала кампаніі «Авіяграта».**

Самалёт удзень каля гарадскога пасёлка Чырвоная Слабада выконваў авіяхімработы над сажалкамі рыбгаса. Згодна з папярэдняй інфармацыяй, у вінт на дастаткова нізкай вышыні патрапіла птушка, з-за чаго паветранае судна і ўпала. Дзякуючы высокай кваліфікацыі пілот імгненна сарыентаваўся, таму атрымаў толькі драпіны. Сам самалёт аператыўна дасталі з вады, у яго механічныя пашкоджанні.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Экалогія побыту

# РЭКІ «ЦВІТУЦЬ» АД... ПРАЛЬНАГА ПАРАШКУ

## Калі ў саставе мыйнага сродку ёсць слова з часткай «фасфа-», ад яго лепш адмовіцца

**Кожнае лета рэкі і азёры Беларусі зарастаюць водарасцямі і пакрываюцца зялёнай плёнкай. Эўтрафікацыя — так спецыялісты называюць гэты працэс. Наогул, узнікае ён натуральна, пры нармальных умовах надвор'я развіваецца павольна і ў невялікіх аб'ёмах. Але апошнім часам вадаёмы «цвітуць» настолькі інтэнсіўна, што не пакідаюць шанцаў ні купацца людзям, ні выжыць рыбам. Аказваецца, вінаваты ў гэтым сам чалавек. Якім чынам мы правакуем «цвіценне» рэк і як беларускія школьнікі і настаўнікі спрабуюць гэта спыніць, даведалася карэспандэнт «Звязды».**

### ЧАМУ ВАДАЁМЫ ЗЕЛЯНЕЮЦЬ?

Яшчэ гадоў 20 таму ўбачыць рэкі, якія «цвітуць», можна было толькі ў канцы ліпеня — пачатку жніўня. Цяпер жа многія вадаёмы зелянеюць ужо ў чэрвені. Звязаны гэтыя перамены не толькі са зменай клімату, але і з некаторымі пераўтварэннямі ў гаспадарчай дзейнасці чалавека.

— Эўтрафікацыя ўзнікае, калі ў вадаём трапляюць злучэнні фосфару або азоту — так званых біягенных элементаў. Яны служаць пажыўным асяроддзем для многіх раслін і водарасцяў. Зразумела, чым больш такіх злучэнняў паступае ў ваду, тым хутчэй размнажаецца і расліннасць, — расказвае **спецыяліст па ўстойлівым кіраванні воднымі рэсурсамі Цэнтра экалагічных рашэнняў, каардынатар праекта «Рэкі без фасфатаў» Кааліцыі «Чыстая Балтыка» Наталля ПАРЭЧЫНА.** — Асабліву небяспеку выклікаюць сіне-зялёныя водарасці. Яны адрозніваюцца ад звычайных тым, што спажываюць шмат кіслароду, не пакідаючы яго іншым арганізмам. У выніку ў вадаёмах утвараюцца «мёртвыя» зоны — месцы, дзе гіне ўсё жывое, у тым ліку і рыба.

Эксперт падкрэсліла, што, як правіла, злучэнні фосфару і азоту паступаюць у вадаём двума шляхамі: праз камунальныя сцёкавыя вады і сцёкі з сельгаспалёў. Ачышчальныя збудаванні справіцца з гэтымі рэчывамі не могуць, так яны і аказваюцца ў нашых вадаёмах.

З усіх злучэнняў фосфару водныя расліны лепш за ўсё засвойваюць фасфаты — рэчывы, якія ў вялікай колькасці змяшчаюцца ў мыйных сродках і пральных парашках. У краінах ЕС з 2012 года ўведзена поўная забарона на выкарыстанне фасфатаў у вытворчасці гэтай бытавой хіміі. У Беларусі пакуль такія змены не прадбачацца, але бесфасфатныя парашкі знайсці можна.

### ЗДАРОЎЕ ТАКСАМА ПАД ПАГРОЗАЙ

Купляючы парашкі і мыйныя сродкі з фасфатамі, чалавек шкодзіць не толькі прыродзе, але і свайму здароўю. У першую чаргу, гэтыя рэчывы небяспечныя для дзяцей і алергікаў. Так, трапляючы на скуру, яны могуць выклікаць алергічныя рэакцыі ў выглядзе лушчэння і пачырванення. Пры гэтым з кожным годам з'яўляецца ўсё больш людзей, адчувальных да фасфатаў.

Не варта таксама забываць: фасфаты аказваюцца і ў вашых любімых вадаёмах, дзе вы прывыклі адпачываць летам.

Пры гэтым эколаг дадае: калі парашок без фасфатаў, гэта не значыць, што ён адмывае горш. Бясспрэчна, злучэнні фосфару дадаюць у мыйныя сродкі не проста так: яны зніжаюць жорсткасць вады (дзякуючы чаму парашок больш пеніцца і лёгка адмывае рэчы). Але ёсць і прыродныя мінералы, напрыклад цэаліты, якія маюць тыя ж уласцівасці, але вадаёмам і здароўю не шкодзяць.

### 10 КРОКАЎ ДА ЧЫСТЫХ ВАДАЁМАЎ

Зрабіць так, каб фасфатаў у нашых вадаёмах стала менш, сёння можа кожны з нас. Праўда, пакуль не ўсе разумеюць сур'ёзнасць праблемы. Прасвятліць як мага больш беларусаў па гэтай тэме ўзялася каманда Цэнтра экалагічных рашэнняў — яна арганізавала для настаўнікаў інфармацыйную кампанію «Рэкі без фасфатаў».

Стартавала кампанія ў студзені і працягнулася тры месяцы. Удзел у ёй прыняла 21 навучальная ўстанова (21 настаўнік) з 10 раёнаў Мінскай, Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей.

— Мы прыдумалі 10 крокаў, якія павінен прайсці кожны настаўнік, каб нашы вадаёмы пачысцелі. Па ўмовах трэба было выканаць пяць крокаў абавязкова і пяць — па жаданні. Але самая галоўная ўмова — далучыць да кампаніі як мага больш дзяцей, знаёмых, сяброў — каго заўгодна. Настаўнік не павінен быў выконваць усё адзін, — падзялілася эксперт.

Такім чынам, удзельнікі правялі анкетаванне мясцовых жыхароў, каб апошнія даведаліся, якую шкоду фасфаты наносяць навакольнаму асяроддзю. Зрабілі інвентарызацыю бытавой хіміі ў мясцовых крамах, дзе заўважылі, што працэнт колькасці бесфасфатных парашкоў павысіўся амаль у пяць разоў. Аднак не абышлося і без сумных навін: фасфаты знайшліся нават у дзіцячых парашках.



Таксама настаўнікі зрабілі запіс у «Кнізе скаргаў і прапаноў», каб павысіць попыт на бесфасфатныя парашкі, а каля крамаў, дзе яны былі, павесілі плакаты са словамі «Тут можна купіць парашкі без фасфатаў».

— На апошнім кроку кожны настаўнік распрацоўваў свае заняткі і дзяліўся атрыманымі ведамі з іншымі ўдзельнікамі. І вось настаўніца з вёскі Башні Шумілінскага раёна спытала ў школьнікаў у канцы ўрока, чаму іх навучыла гэтая кампанія. У асноўным усе казалі, што не будуць купляць парашкі з фасфатамі, будуць уважліва чытаць састаў, а адзін сказаў: «А я вось больш не буду мыць шкарпэткі ў рэчцы». Дзіця шчыра адказала, значыць, дастукаліся! — адзначыла Наталля Парэчына.

Фасфаты могуць «хавацца» і за іншымі назвамі. Напрыклад: фасфанаты, поліфасфаты, дыкалій фторфасфат, дынатрый фторфасфат, трыпаліфасфат натрыю, монафторфасфат кальцыю і г. д. Звярніце ўвагу, што ва ўсіх выпадках ёсць корань «фасфа-». Чытайце састаў і будзьце пільныя!

**Кацярына ЦІТОВА**

■ Экспертыза

# ВЕДАЙ ЦАНУ СЛОВАМ

**Два новыя віды судовых экспертыз з'явіліся ў Беларусі. Іх патрэба была прадыктавана часам. Цяпер спецыялісты праводзяць судовыя лінгвістычныя і культуралагічныя экспертызы. Супрацоўнікі Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз (ДКСЭ) цяпер маюць паўнамоцтвы выдаць заключэнне аб тым, ці ўтрымлівае тэкст, напрыклад, зняважу, нецэнзурную лаянку, заклікі да экстрэмісцкіх дзеянняў. Судовая культуралагічная экспертыза дапаможа вызначыць, ці з'яўляецца якая-небудзь выява або кінастужка парнаграфічнай. І калі так, то ці дэманструюцца ў іх асобы, якія маюць прыкметы непаўналетніх.**

Аналіз зваротаў праваахоўных органаў і судоў, якія паступілі ў цэнтральны апарат ДКСЭ, паказвае, што на сёння найбольш запатрабаванымі з'яўляюцца лінгвістычныя экспертызы па справах аб знявагах, а таксама экстрэмісцкай скіраванасці.

— Да ўтварэння ДКСЭ доўгія гады не з'яўлялася ніводнай новай экспертызы, і толькі за апошнія тры гады мы асвоілі больш за дзясятак даследаванняў, — кажа **старшыня Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Андрэй ШВЕД.** — Чым жа важная судовая лінгвістычная экспертыза? Сёння востра стаяць пытанні абароны правоў грамадзян, нацыянальнай бяспекі. Да крыніц магчымых пагроз дадаліся інфармацыйныя рэсурсы. Адным з элементаў дэстабілізацыі асветніцкай з'яўляюцца лжывыя ўкіды інфармацыі, дэзарыентацыя, паклёп на адрас службовых асоб. Любая дзяржава павінна апеляваць на гэта рэагаваць — як займацца прафілактыкай такіх з'яў, так і вырашаць пытанне аб адказнасці вінаватых асоб.

Да нядаўняга часу з-за адсутнасці паўнавартаснай судовай лінгвістычнай экспертызы былі пытанні яе правапрымянення. Сёлета ж ужо лік такіх даследаванняў пайшоў на дзясяткі. Мяркуецца, што іх агульны аб'ём за год складзе не менш за тысячу.

— Для таго каб правесці арганізацыйныя мерапрыемствы, спатрэбілася амаль два гады, — працягвае Андрэй Швед. — Трэба было падабраць і навучыць кадры. Падрыхтоўка спецыялістаў заняла каля года. Амаль усе яны вучыліся за мяжой. Судовая лінгвістычная экспертыза не запатрабавала пашырэння штатаў, мы прынялі рашэнне экспертаў-фонаскапістаў навучыць новым ведам. Гэта дазволіла сэканоміць рэсурсы, у тым ліку і фінансавыя.

Судовая лінгвістычная экспертыза праводзіцца ў Мінску і абласных цэнтрах. А вось высветліць, ці ёсць на выяве прыкметы парнаграфіі, пакуль можна толькі ў сталіцы. Мяркуецца, што судовых культуралагічных экспертыз будзе прыкладна 800—1000 за год.

Перад судовай лінгвістычнай экспертызай будуць ставіцца задачы высветліць, ці ёсць у прадмеце даследавання — прамове, друкаваным або электронным тэксце — наяўнасць прыкмет зняваг і экстрэмісцкіх выказванняў. Для нашых грамадзян на пабытовым узроўні з'явілася магчымасць адстойваць гонар і годнасць у любым працэсе: адміністрацыйным, грамадзянскім і крымінальным. Лічым, што нашы паслугі будуць запатрабаваны і сярод бізнесменаў — напрыклад, калі нядобрасумленныя канкурэнты размяшчаюць інфармацыю, якая зневажае гонар і годнасць. Эксперт будзе даваць заключэнне не па адным, вырваным з кантэксту слове, а па інфармацыі агулам і ў кантэксце развіцця сітуацыі.

Мы распрацавалі нацыянальную методыку экспертыз, але ўлічвалі пры гэтым досвед іншых дзяржаў. Справа ў тым, што ва ўсіх краінах падыходы адрозніваюцца. Мы карысталіся расійскім досведам. У нас блізкая моўная культура, менталітэт.

А якая ж цана пытання для новай экспертызы ў прыватным парадку? Замовіць яе можа кожны чалавек. Як сцвярджае Андрэй Швед, вельмі высокім кошт не будзе. Справа ў тым, што правядзенне гэтых экспертыз не вымагае выкарыстання якіх-небудзь расходных матэрыялаў. У арсенале спецыялістаў — толькі іх веды і даведнікі.

У інструментарыі **галоўнага эксперта аддзела фанаскапічнага ўліку і дыягностыкі ўпраўлення фанаскапічных экспертыз ДКСЭ Алены ТРЫБУТ** — больш за дзясятак самых разнастайных слоўнікаў.

— Усе выданні сучасныя. Праўда, слоўнікамі Даля, Ожагава ці Ушакова мы не карыстаемся. За акном XXI стагоддзе, а яны ўжо састарэлі. Тым больш што недастаткова проста адкрыць слоўнік і знайсці патрэбнае слова. У нас ужо былі прыклады, калі адно і тое ж слова мела, напрыклад, 10 розных значэнняў. У іх ліку — як нейтральныя, так і адмоўныя. Таму мы карыстаемся сама меней трыма рознымі слоўнікамі. Але задача адна — выбраць пэўнае значэнне і аргументавана даказаць, што менавіта яно і маецца на ўвазе ў тэксце, які ляжыць на стале ў эксперта.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

# А вы ўмееце рабіць масаж сэрца?

## Першая дапамога: уніфікаваны падыход да навучання

**У Беларусі ствараецца адзіная дзяржаўная сістэма навучання насельніцтва метадам аказання першай дапамогі пры станах, якія ўяўляюць пагрозу для жыцця і (або) здароўя чалавека. Гэта замацавана ў праекце пастановы, які выносіцца на грамадскае абмеркаванне.**

Як растлумачылі ў прэс-службе Міністэрства аховы здароўя, адзіная сістэма дазволіць навучыць насельніцтва навыкам аказання першай дапамогі да прыбыцця медыкаў на месца здарэння. Гэта будзе садзейнічаць зніжэнню смяротнасці і інваліднасці з-за нясвоечасовага і няправільнага аказання такой дапамогі.

Навучанне насельніцтва будзе ажыццяўляцца асобамі, якія маюць вышэйшую або сярэднюю спецыяльную медыцынскую адукацыю на базе вучэбна-трэніровачных цэнтраў арганізацый, якія аказваюць медыцынскую дапамогу і адукацыйныя паслугі па профілі «Ахова здароўя», любой формы ўласнасці, у тым ліку ў арганізацыях Чырвонага Крыжа.

У цяперашні час у нашай краіне дзейнічае сістэма навучання навыкам аказання першай дапамогі кантынгентаў, якія працуюць па розных напрамках дзейнасці. Гэтыя пытанні ўключаны ў праграмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кіроўцаў механічных транспартных сродкаў усіх катэгорый; работнікаў, звязаных з перавозкай небяспечных грузаў; работнікаў арганізацый, якія эксплуатуюць электраўстаноўкі; работнікаў, звязаных з эксплуатацыяй водаправодных і каналізацыйных сетак; работнікаў сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, занятых у зялёнай гаспадарцы; персаналу санітарных фарміраванняў.

Азнаёміцца з праектам пастановы можна на сайце Міністэрства аховы здароўя. Прапановы па дакументе прымаюцца да 10 жніўня бягучага года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ЯК «ЗВЯЗДОЎКА» АРХЕОЛАГАМ СТАЛА...

## САКАЛІНАЯ ЦЫТАДЭЛЬ

Адна з адметнасцяў раскопак у Сокале — дакладная дата большасці знойдзеных тут артэфактаў — 25 верасня 1579 года, калі крэпасць была знішчана. Цытадэль абаранялі маскоўскія стральцы арміі Івана Грознага, якіх цар паслаў на дапамогу сваім людзям у захопленым імі да гэтага Полацку, які асаджалі войскі Рэчы Паспалітай на чале са Стафанам Баторыем.

Крэпасць мела 11 драўляных вежаў, злучаных паміж сабой частаколам і абкружаных земляным ровам, дзве царквы і жыллёвыя пабудовы, што займала каля чатырох гектараў. З трох бакоў яе сцены абаранялі воды рэк Нішча і Дрыса, якія зліваюцца тут.

— Цытадэль мае выключнае значэнне для археалагічнай навукі, паколькі яе захоп і знішчэнне датуюцца літаральна адным днём, гэтаксама як і выпадзенне ўсіх знаходак у культурны пласт, — адзначае **Марат КЛІМАЎ, супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі.** — У першы год мы патрапілі на згарэлыя драўляныя канструкцыі і думалі, што гэта брама вежы. А, можа, гэта была і царква, бо знайшлі шмат аплаўкаў бронзы, якія маглі аказацца звонам. Ужо летась мы знайшлі цэлую частку гэтай брамы, што рэальна пацвердзіла першапачатковую версію. Знайшлі цвікі ад рашоткі гірсы — пад'ёмнага моста. Каб поўнасцю знайсці ўсе пабудовы крэпасці, трэба раскапаць вялізную плошчу. Хоць ужо цяпер зразумела, што бліжэй да брамы жылі простыя стральцы, а ў цэнтры фартэцыі — начальства.

Летась ПАЛьцы адкапалі некалькі пабудоў крэпасці і здабылі з зямлі сярод іншых артэфактаў унікальную рэч — касцяны нацельны крыж, які, як думаецца, належаў камандзіру стральцоў. Сёлетняе юбілейнае «паляванне на даўніну» прывяло на могілкі. Па апошніх звестках, знойдзена ўжо 12 шкілетаў, на адным з якіх былі пацеркі і фібула.

## «СЯРЭДНЯВЕЧНАЯ ПЯСОЧНІЦА»

Археалагічная раніца, як заўжды, пачынаецца са звону чарпака па місцы — гэта дзяжурныя згатавалі кашу і склікаюць на сняданак. На свежым паветры есца са смакам, кашу «наварочваюць» нават тыя, хто верне ад яе нос дома. А нелюбімую для многіх малых страву — суп — у абед дзеці часта просяць на дабаўку.

Менш чым праз гадзіну пасля пад'ёму валанцёры ўжо на раскопе. Вакол яго луг з кветкамі, абкружаны соснамі. Дзеці легіянераў і самі ПАЛьцы з задавальненнем гуляюць тут у свабодны час у футбол. Падчас работ малыя дапамагаюць перабіраць зямлю ў пошуках артэфактаў. Калі стамляюцца — гуляюць у «сярэднявечнай пясочніцы» — яме з-пад леташняга раскопу з жоўтым мяккім пяском ці знаходзяць іншыя забаўкі ў лагеры і лесе.

Цікава, што дзіцячая «банда» большасць часу праводзіць сама па сабе. Амаль для ўсіх такое падарожжа ў навіну, таму бацькоў ад раскопак не адрываюць. Ды і ведаюць, што пасля абеду адпачынак будзе ўжо сумесны. Плаваюць малыя з бацькамі тут і ранкам, і днём і ўвечары. Да камароў прызвычайваюцца ўжо на другі дзень, а самае галоўнае — тут яны ў пэўнай ступені становяцца самастойнымі і незалежнымі і знаходзяць свае першыя артэфакты. А яшчэ адчуваюць сябе такімі ж паўнапраўнымі ПАЛьцамі, як і дарослыя, бо ўсіх дзяцей, старэйшых за пяць гадоў, хто пабываў на раскопе, пасвяцілі ў археолагі.



Здаецца, што адчуванне свабоды, бязмежных магчымасцяў і эмацыянальнага натхнення тут застаецца праз гады. Больш за тое, некаторыя легіянеры пажаніліся і нарадзілі дзетак, пазнаёміўшыся менавіта на раскопе, і цяпер прывозяць іх з сабой. Я сама стала ПАЛькай яшчэ ў 2000 годзе, калі ўпершыню трапіла ў экспедыцыю ў камандзіроўку, і дагэтуль не магу адмовіць сабе ў гэтай «дзікай прыроднай раскошы».

Успомніла ўсё. І як падымацца а шостай гадзіне раніцы, калі шэф прызначае цябе дзяжурнай, каб зварыць на сняданак вядро кашы і вядро гарбаты. І як ты пры гэтым адчуваеш сябе, бо легла толькі ў тры, бо золак заспеў цябе за размовамі з сябрамі, з многімі з якіх, асабліва не мінскімі, дзе яшчэ пабачышся, як не на раскопе. І як зацякае спіна ад доўгага сядзення на адным месцы, пакуль перабіраеш зямлю. І як гэта цудоўна — вырвацца са звычайнай руціны дарослага жыцця ў ПАЛ.

## ПІЯНІНА Ў ПАЛАТЦЫ І ЛАЗНЯ Ў БЕРАЗЕ

Рамантыкі, эмоцый, прыгод і працы за гэтыя гады ў ПАЛе сапраўды хапала. Пад вёскай Лучна ў Полацкім раёне, дзе і нарадзілася суполка, валанцёры пад кіраўніцтвам Марата Клімава капалі з 1998-га да 2005-га. Гэты перыяд лічыцца, як кажа нязменны шэф экспедыцыі, класічным ПАЛам. За сем гадоў археолагі добра абжыліся ў лесе. Нават палаткі, якія ўжо сталі роднай хатай, штогод стараліся ставіць на ранейшыя месцы, арыентуючыся на пракапаныя па перыметры траншэі для адводу дажджавой вады.

А яшчэ ў нас была лазня, выкапаная ў беразе Дзвіны, самаробная вяндлярня ў зямлі, валейбольная пляцоўка з шышкамі. Ежу гатавалі ў вёдрах (часта з рачной вады), у рацэ ж плавалі і мылі посуд на шчасце рыбам. Працавалі на раскопе да абеду, пасля яго ледзьве не штодня ладзілі тэматычныя святы, якія ствараліся на імпэце, замешаным на энтузіязме. Тут вам не толькі Купалле, а і фестываль мадэрнізму, «Бітва на Нямізе», «Паляванне на маманта». А ўначы была картачная гульня ў мафію ды спевы пад гітару, варган і піяніна — яно ў асобнай палатцы стаяла. Быў у Лучне і язычніцкі бог вандроўнікаў Торвальд, якога кармілі кашай. І кожны атрымліваў уласны нік, каб не было блытаніны са звычайнымі імёнамі.

Асабліва помняцца валанцёрам вечары з кубачкам архелы — спецыяльным моцным напоем на зёлках, а таксама аладкі, якія пяклі на лапаце, адзін кавун на 30 чалавек як найлепшы пачастунак...

Першапачаткова на раскопках у Лучне меліся знайсці манастыр Святога Міколы на Лучне, датуемы XVI стагоддзем. Першыя ж знаходкі павялічылі ўзрост пабудовы да канца XI стагоддзя. А пазней версія пра манастыр увогуле адпала. Затое за восем гадоў экспедыцый ПАЛьцы змаглі вывучыць жыццё ў сядзібе заможнага феадала — менавіта яе ўрэшце раскапалі.

Каб захаваць ў гісторыі ўспаміны аб раскопках, валанцёры здымалі пра экспедыцыі фільмы (тады яшчэ на старую касетную відэакамеру). І стасункі не канчаліся пасля змены. ПАЛьцы сустракаліся і ў Мінску, адкуль прыязджала большая частка легіянераў. Акрамя абавязковых перасячэнняў раз на тыдзень дзе-небудзь у горадзе, разам святкавалі Хэлоўін, Масленіцу, Новы год, ладзілі чэмпіянаты па паяданні дранікаў — усяго хапала.



## З СУЧАСНАГА ДОМА ТРЭБА ЗБЯГАЦЬ ЧАСЦЕЙ

Святкаванне 20-гадовага юбілею існавання ПАЛа і паралельна ўдзел у раскопках — для многіх «старых» валанцёраў — не простая дата, а ўспамін часоў, калі яны, натхнёныя рамантыкай, трапілі ў экспедыцыю і ўцягнуліся ў археалагічнае жыццё. 2000-ы год быў адным з самых цяжкіх для раскопак — дажджы лілі тыднямі, аднак валанцёры ўспамінаюць, што было цудоўна.

— Тады пэўна, сышліся нейкія зоркі, ды і пакаленне было іншае. Мы ехалі па эмоцыі і стасункі, а цяпер ціснеш кнопачку ў гаджэце і атрымліваеш сваю порцыю эндарфінаў, — разважае Чэх, які пазнаёміўся са сваёй жонкай Джуліяй менавіта ў ПАЛе.

— Мой сын Сцёпа тут плавае па тры-чатыры разы на дзень, ён гойсаў па раскопе з металашукальнікам, танцаваў пад дажджом, — дзеліцца Кошачка, якая знайшла на раскопе свайго Фядота. — І хоць ён ные, што, можа, час і дахаты, думаю, нашы дзеці сталі тут мацнейшыя, і гэты вопыт паўплывае на іх жыццё з гарадскімі гаджэтамі. А як ён пахваліцца сваім аднакласнікам, дзе быў летам...

— Ды калі б мы тут пражылі хоць бы тыдзень, у іх было б ужо сваё асобнае паселішча, — дадае Алекстоп.



Сам склад валанцёраў за 20 гадоў мяняецца, упэўнены шэф экспедыцыі, для якога ПАЛ, як і для многіх валанцёраў, — адна вялікая сям'я. Цяпер з'явілася шмат магчымасцяў зрабіць жыццё разнастайным, змяніліся прыярытэты, ды і самі ўмовы жыцця ў лагеры. Раней у нас бадай што не было інтэрнэту і мабільнікаў. Да лагера звычайна дабіраліся аўтастопам, з заплечнікам, дзе ўмяшчалася ўсё неабходнае: спальнік, турыстычны дыванок, змена адзення і прысмакі на ўсіх легіянераў. Цяпер ледзьве не кожны трэці прыязджае на аўто і вязе з сабой дадатковыя выгоды. Сёлета нават турыстычная лазня з парылкай у выглядзе спецыяльнай палаткі была.

— Нашы юбілеі — гэта перш за ўсё магчымасць атрымаць стасункі з людзьмі, якія не бачыліся па 10—15 гадоў, а не свята. Людзі хочуць успомніць, як гэта было. Я бачу, што валанцёры тых гадоў цяпер больш дарослыя, аднак у вачах той жа бляск, — кажа кіраўнік раскопак. — На жаль, цяпер няма такога прытоку людзей. Тады было па дзве змены амаль на ўсё лета, цяпер — некалькі тыдняў. Ды і ўзрост валанцёраў павялічыўся. Замест студэнтаў, як было раней, прыязджаюць больш сталыя людзі. Сам фармат таго, што трэба бясплатна працаваць на раскопе, адсейвае непатрэбных людзей.

**Летась ПАЛьцы адкапалі некалькі пабудоў крэпасці і здабылі з зямлі сярод іншых артэфактаў унікальную рэч — касцяны нацельны крыж, які, як думаецца, належаў камандзіру стральцоў. Сёлетняе юбілейнае «паляванне на даўніну» прывяло на могілкі. Па апошніх звестках, знойдзена ўжо 12 шкілетаў, на адным з якіх былі пацеркі і фібула.**

Больш за тое, экспедыцыя жыве бадай што адным самафінансаваннем. Валанцёры плацяць за магчымасць пакапацца ў зямлі — грошы (даволі сімвалічныя сумы) ідуць на харчаванне. Так што тут збіраюцца сапраўдныя энтузіясты, для якіх жывыя стасункі і эмоцыі важнейшыя за курортныя — «усё ўключана».

Дарэчы, цяпер, хоць і стала больш магчымасцяў для рэкламы, трапляюць у ПАЛ больш праз знаёмствы. Вось і Юргельса з Адмінтэем запрасіў на раскопкі сябар, які тут ужо быў.

— З мінусаў тут камары, авадні і дождж. Затое якая лямпавая (спакойная, душэўная) атмасфера, — апісваюць яны сваё ўспрыманне жыцця ў лагеры. — Добра, што тут няма гарадскіх пацех. Нарэшце можна выйсці з сацыяльных сетак. Хоць і пісаў Рыгор Барадулін: «трэба дома бываць часцей, трэба дома бываць не госцем», але ж з сучаснага дому трэба наадварот збягаць часцей, «каб не страціць святое штосьці».

А найлепшым паказчыкам таго, ці будуць нашы дзеці хацець атрымаць археалагічную рамантыку ў спадчыну і працягнуць наш энтузіязм, будзе, калі яны наступным годам скажуць: «А паехалі ізноў у ПАЛ».

**Ірына СІДАРОК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# «АЛЬБЯРЦІН» — НАЙСТАРЭЙШЫ БРЭНД БЕЛАРУСІ



**Сёння назва гэтага прадпрыемства ў людзей недасведчаных можа і не выклікаць ніякіх асацыяцый: ААТ «Слонімскі кардонна-папяровы камбінат «Альбярцін». Але на самай справе толькі работнікі гэтага камбіната з гонарам могуць сказаць, што двухвекавая гісторыя іх прадпрыемства і гісторыя Беларусі перапляліся настолькі, што іх нельга раз'яднаць.**



Галоўны дырэктар — АНТОНІК Мікалай Уладзіміравіч.

Папяровая фабрыка ў Слоніме была пабудавана ў 1806 годзе графам Войцехам Пуслоўскім адразу пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай. Першапачаткова гэта была класічная еўрапейская мануфактура таго часу, адзіным адрозненнем якой ад падобных вытворчасцяў у Еўропе было тое, што яна размяшчалася ў непасрэднай блізкасці ад



палаца гаспадара вытворчасці. Палац Пуслоўскіх узведзенны на набярэжнай возера. У доме для чэлядзі, які стаяў за палацам, сёння знаходзіцца спартыўны клуб, а ў былых стайнях размяшчаецца забаўляльны цэнтр з рэстаранам.

Сваёй назвай цяперашні камбінат абавязаны сыну графа Альбярціну Пуслоўскаму, да яго гібелі сядзіба насіла назву Юрзнікі. Аб прычынах яго смерці захавалася легенда, згодна з якой Альберт выпадкова патануў у возеры разам са сваёй дачкой. Работнікі Альбярцінскага забаўляльнага цэнтра расказваюць сваім наведвальнікам, што па дарозе на работу ў начную змену яны бачылі прывід дзяўчыны.

Увогуле ў Слонімскім раёне багата легендаў і міфаў. Адна з іх распавядае, як граф Пуслоўскі, вяртаючыся ў свой маёнтак, трапіў пад навальніцу. Побач з дарогай ляжаў вялікі валун. Граф выйшаў з карэты і схаваўся пад казырок валуна. У гэты момант ударыла маланка і раскалола камень напалам. У знак таго, што камень захаваў яму жыццё, Пуслоўскі загадаў прывезці яго ў свой маёнтак. Рабочыя, спрабуючы дастаць валун, выкапалі чатырохметровую яму, але да падножжа каменя дакапаца так і не змаглі. Тут паставілі крыж, які з часам знік, але камень застаўся. Цяпер яго нярэдка называюць Каменем закаханых.

Самым прывабным месцам у Альбярціне з'яўляецца набярэжная возера, дзе найбольш маляўнічы — масток каля вадаспада. Тут пабудавана і ўведзена ў строй летась першая ў Гродзенскай вобласці прыватная гідраэлектрастанцыя. Карта са спадарожніка, якую кожны з нас можа паглядзець у інтэрнэце, паказвае Альбярцінскае возера, што ў паменшаным памеры нагадвае карту Беларусі. Варта адзначыць, што сур'ёзная рэканструкцыя і аднаўленне сядзібы Пуслоўскіх пачаліся толькі ў постсавецкія часы. Гэта выглядае парадаксальна, але ўсё ж застаецца фактам, што яшчэ ў пачатку 70-х гадоў мінулага стагоддзя падобныя сядзібныя пабудовы былі ў вельмі занядбаным стане. Усім вядомы фільм з трылогіі Анатоля Рыбакова «Бронзавая птушка» прыйшлося здымаць у Літве ў сядзібе Балінскіх.

Але ўсяму, што можна наглядна ўбачыць сёння, пасёлак Альбярцін абавязаны кардоннапапяроваму камбінату. У тым выглядзе, у якім мы прывыклі яго бачыць і ўспрымаць сёння, з усім вядомым таварным знакам — ласём, які рвецца ўвысь. Прадпрыемства пачало сваю дзейнасць у 1927 годзе з вытворчасці кардону. У савецкі час, практычна да самага





распаду СССР, слонімскі камбінат быў манапалістам па вытворчасці каляровага пераплётнага кардону. Многія памятаюць яго прадукцыю хоць бы па тых кнігах, што выдаваў Мінскі паліграфкамбінат, які лічыўся адным з самых буйных і перадавых у савецкі час. Як і ўсе прадпрыемствы падобнага профілю, на пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя Слонімскі кардонна-папяровы камбінат «Альбярцін» зведаў нямала цяжкасцяў пры пераходзе да рынку. У 1995 годзе камбінат быў пераўтвораны ў адкрытае акцыянернае таварыства «Слонімскі кардонна-папяровы завод «Альбярцін».



Змены на сусветным рынку вырабаў папяровага профілю, падзенне попыту на друкаваную прадукцыю вызначылі на камбінаце сур'ёзную рэканструкцыю па ўсіх кірунках. Сённяшні спектр выпускаемай прадукцыі толькі па кардоне складае больш за дваццаць найменняў і пазіцый. Сур'ёзныя змены адбыліся і ў вытворчым блоку, які выпускае паперу. Замест традыцыйнай папяровай прадукцыі перавага аддаецца выпуску паперы, якая выкарыстоўваецца ў якасці ўпакоўкі, з рознымі ступенямі абароны ад вільгаці, і вялікаму спектру прадукцыі санітарна-тэхнічнага прызначэння: паперы гафрыраванай, пачкавай двухслаёвай, упаковачнай, парафінаванай, для вытворчасці сурвэтак, вільгацетрывалай санітарна-гігіенічнага прызначэння.



Засталіся традыцыі і двухвекавы брэнд, які выклікае зацікаўленасць у пакупнікоў. Сплаў творчасці і вопыту, сістэмны падыход да ўсіх праблем сучаснага жыцця, ідэальнае месцазнаходжанне па лагістыцы дазваляюць упэўнена глядзець не толькі ў заўтрашні дзень, але і на многія гады наперад.

УНП 500040691

# МЭБЛЕВАЯ КАРУСЕЛЬ

**Калі ўявіць сабе машыну часу, якая рухаецца назад у мінулае, то што б вы прапанавалі для зрокавага ўспрымання? Выстаўку адзення, абутку, прадметаў побыту? Як у чымсьці адным гарманічна і проста выкласці карціну нядаўняга мінулага? Такая пастаноўка пытання для многіх, хутчэй за ўсё, стала б складанай, а роскід меркаванняў і прапаноў такі шырокі, што цяжка было б прыйсці да агульнага назоўніка. Я прапанаваў бы зрабіць выстаўку мэблі, дзе ў кожнай зале будуць выстаўлены прадметы мэблі, якімі мы карысталіся ў розныя дзесяцігоддзі. Гэта была б наглядная хроніка росту нашага дабрабыту, густаў і моды, узроўню культуры і іншага.**



Сярод усіх мэблевых прадпрыемстваў Беларусі ААТ «Слоніммэбля» займае асаблівае месца. Яно было арганізавана ў 1939 годзе ў выглядзе арцелі «Чырвоны сталяр» і працавала ў рэжыме невялікай мясцовай вытворчасці. Прамысловае аблічча фабрыка прыняла пасля вайны ў 1956 годзе



і адразу ж заваявала аўтарытэт у савецкіх пакупнікоў таго часу. У сланімчан тут было ўсё як ва ўсіх: паскораная мадэрнізацыя па выпуску масавых відаў мэблі для малагабарытных кватэр савецкіх грамадзян. Вытворчасць у той час была заснавана на модульным прынцыпе: мэбля выраблялася ў асноўным з нарыхтовак паўфабрыкатаў з драўняна-стружкавай пліты. Знешняе афармленне мэблі з цягам часу мянялася. На змену паліраваным пакрыццям, што ўяўляюць сабой пліту ДСП, на якую пад



ціскам наклейвалася папера з малюнкам «пад дрэва», затым ішлі заліўка лакам і паліроўка прамысловымі шчоткамі да люстранога бляску, прыйшла матавая мэбля з новымі дэкорам і фурнітурай.

Змяненне якасці і асартыменту суправаджалася ростам дабрабыту савецкіх грамадзян. Мэблевыя вытворчасці па ўсёй краіне не спраўляліся з узроўнем патрэб: чвэрць стагоддзя ў Савецкім Саюзе мэбля была асноўным відам таварнага дэфіцыту. Цэны на новыя віды прадукцыі з кожным годам раслі, але гэта не здымала ажыятажнага попыту. Наяўнасць «сценкі» або спальнага гарнітура была візітнай карткай кожнай паспяховай савецкай сям'і.

У той час беларускія мэбельшчыкі, ствараючы новыя калекцыі, пры выбары назваў аддавалі перавагу нацыянальным аб'ектам прыроднага ландшафту. Любая мэблевая крама таго часу была яшчэ і падручнікам беларускай геаграфіі. Мэблевыя гарнітуры мелі назву беларускіх рэк і азёр. Для сланімчан у той час візітнай карткай стаў набор для спальні «Шчара» — ад назвы невялікай ракі, якая працякае ў Слоніме і дзеліць горад на дзве часткі. Гэты набор і сёння выпускаецца ў Слоніме ў крыху перайначаным выглядзе, з больш жорсткімі параметрамі якасці. Але тым жа непрыкметным і непаўторным шармам. Гэта класічны набор для тыпавога жылля, які ўключае двухспальны ложак, камоду, шафу для адзення і дзве прыложкавыя тумбачкі. Каркасы модульных элементаў выраблены з ЛДСП, фасады — з МДФ. Колер у гэтага спальнага набору самы папулярны — арэхавы. Спальны гарнітур афармлены разным дэкорам.

Навінкай апошняга часу, якая дазваляе гаварыць аб стабільным трэндзе ў арганізацыі і планаванні вытворчасці на ААТ «Слонімммэбля», з'яўляецца спальны гарнітур «Венецыя». Па сутнасці, назва гаворыць сама за сябе. Гэта класічны мадэрн, створаны ў спалучэнні белых фасадаў, вялізных люстэркаў і храміраваных паверхняў стыльнай фурнітуры. Выбаўляецца такі гарнітур «пад заказ», то-бок камплект мэблі з'яўляецца «адкрытым». Заказваючы спальны набор, можаце самі зменшыць/павялічыць як плошчу, так і аб'ём адзежнай шафы або ложка ў залежнасці ад плошчы пакоя і вышыні яго столяў. Ложак у «Венецыі» ўзвышаецца на закрытым корпусе і мае высокае прамавугольнае падгалоўе з рамным, лаканічным і стыльным дэкорам — у ім няма нічога лішняга, няма ніякай вычварнасці. Адзежная шафа, якая прапануецца, асіметрычная — з аднаго боку выкарыстоўваецца люстэрка, а з другога — белы матавы тон з гарызантальным рассячэннем. Гэта прыбірае эфект таго, што можна адчуць пры абсалютным дамінаванні люстэркаў — пачуццё таго, што за вамі падглядаюць. З іншага боку, пры жаданні паглядзець на сябе збоку вы зможаце ўбачыць сваё адлюстраванне ў поўным аб'ёме, але гэта прастора строга абмежаваная, вы ёю карыстаецеся толькі тады, калі ў вас ёсць для гэтага жаданне. Беласнежная камода і тумбачкі аснашчаны плоскімі скабамі, якія працягваюцца паласой серабрыстага металіку па накрыўках высоўных шаф.

Гасцёўня «Эліяна», напэўна, прыцягне ўвагу ўладальнікаў вялікіх кватэр або загарадных катэджаў. Гэта мэбля, выкананая ў палацавым стылі. Колер мэблі — белы з велізарным багаццем дэкаратыўных эле-



ментаў, пакрытых пазалотай. Акрамя ўрачыстасці, «Эліяна» максімальна функцыянальная за кошт удалага разліку аб'ёму, умяшчальнасць шаф і камоды не саступае па памеру вялікай шафе.

Пад такой жа назвай выкананая і мэбля для сталовай. Арэхавы колер надасць спакою і непаўторнай і звыклай утульнасці. Камплект спалучае ў сабе лепшыя прадметы, выкананыя з першакласных матэрыялаў найвышэйшай якасці. Шыкоўны дызайн мэблі надасць памяшканню ўнікальнасць, ператварыўшы звычайныя прадметы інтэр'ера ва ўпрыгажэнне дома. Вы на самай справе адчуеце сябе арыстакратам.

Да ўвагі ўсіх, хто цікавіцца прадукцыяй слонімскіх мэбельшчыкаў, — сайт прадпрыемства. На ім вы зможаце паглядзець не толькі фотаздымкі ўпадабаных гарнітураў, але і знойдзеце адрасы магазінаў, у якіх зможаце візуальна ўбачыць выбраныя вамі камплекты. Заказаць мэблю можна і па інтэрнэце, а калі нешта для вас незразумела, то можна адправіць электронны ліст на адрас прадпрыемства — вам абавязкова адкажуць. ААТ «Слонімммэбля» чакае вас і заўсёды рада выканаць любы з вашых заказаў. Абнавіце свой мэблевы «гардэроб», купіце мэблю слонімскіх вытворцаў, а старую адвязіце на дачу або аддайце сваякам. У мэблевай каруселі вы адчуеце сябе сапраўдным кіроўцам.

УНП 500523227

**Ігар КАЗЛОЎ.**



■ Пад адкрытым небам

# Акардэаністы, вулічны тэатр, флячкі

## Заўтра ў сталіцы пройдзе фэст «Дзень Польшчы ў Мінску»

Тэрыторыя Верхняга горада мае быць на цэлы дзень прысвечана Польшчы, польскай культуры і таму, што запланавалі для наведвальнікаў пасольства Польшчы, Польскі Інстытут і Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт. Заўтра ў сталіцы можна будзе стаць удзельнікам адмысловага фэсту, прысвечанага 100-годдзю аднаўлення незалежнасці, якое сёлета адзначае наша заходняя суседка. А таксама паслухаць дававенны польскі джаз, навучыцца гатаваць польскія стравы і даведацца, дзе і як вывучыць польскую мову.

Праграма датычыцца не толькі сферы мастацтва, але і навукі, гісторыі, спорту і цалкам прыкладных рэчаў, што напэўна прыцягне да Ратушы багата гасцей. Перш за ўсё скажам, што фэст паклапаціўся пра музыку, тэатр, выставачныя экспазіцыі і кнігі.

Днём музычная пляцоўка — Верхні горад будзе падзелены на некалькі тэматычных сфер — сцэнай для вакальных і танцавальных калектываў польскай дыяспары ў Беларусі, а таксама гасцей з Польшчы — Маладзёжнага духавога аркестра з Гайнаўкі і шоу мажарэтак. А вечарам свінг, танга і дававенны польскі джаз у сучасных аранжыроўках ад калектыву «Jazz Band Mlinarski-Masecki», які займеў папулярнасць не толькі ў сваёй краіне, але і за яе межамі. Як унікальную з'яву арганізатары пазіцыянуюць акардэаністаў «Motion Trio». «Іх музыка выклікае эмоцыі, параўнальныя з уражаннямі ад клубнай тэхна-вечарынкі, акадэмічнага ці нават рок-канцэрта».

Тэатр будзе прадстаўлены ў вечаровым Карэтным дворыку калектывам «Ніколі» і яго вулічнай пастаноўкай «Імпрэсарыа» з артыстамі ў якасці галоўных герояў. А выстаўка — у дворыку мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага — пакажа тое, што з польскіх скарбаў уключана ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

На фэсце можна будзе знайсці і набыць кнігі польскіх аўтараў у перакладзе на беларускую мову — сярод прапаноў моўна-адукацыйнага кірмашу на арт-тэрасе за канцэртнай залай «Верхні горад». Уласна, гэта і ёсць месца, дзе зацікаўленыя ў засваенні польскай мовы наведвальнікі даведаюцца, дзе і як яе вывучаць, і паўдзельнічаюць у моўных гульнях і конкурсах.

Пра кухню трэба было казаць у першую чаргу, але прыходзіцца стрымліваць сябе фарматам культурнай старонкі. У Верхнім горадзе заўтра акажуцца небезвядомыя польскія шэф-повары, якія правядуць майстар-класы і на вачах у наведвальнікаў прыгатуюць традыцыйныя польскія стравы. Каралеўскі суп, белы боршч, страва на заквасцы з жытняй мукі журэк (дзеля справядлівасці адзначым, што ён традыцыйны для беларускай кухні таксама). Суп з ялавічных рубцоў флячкі (зноў нешта агульнае з Беларуссю). Бігас з капусты і мяса (і ў нас яго гатуюць). Духмянае дзеянне будзе адбывацца ў дворыку гатэля «Манастырскі», але на працягу дня фудкорты з польскімі традыцыйнымі стравамі будуць таксама працаваць на плошчы Свабоды.

Трацiць калорыі варта прыйсці на пляцоўку каля рэстарана «Рэнесанс», дзе прафесіяналы і аматары змогуць сыграць у спартыўную гульню рынга, некалі прыдуманую Уладзімірам Стрыжэўскім. Будуць і майстар-класы, і конкурсы, і паказальныя матчы.

Воблакі ў прабірцы, самаробныя петарды, парад рознакаляровых агнёў — гэта ў Карэтным дворыку ад навукова-забаўляльных майстэрняў, дакладней ад Лабараторыі Марыі Складоўскай-Кюры і музея эксперыментальных навук «Эксперыментус». Кажуць, адбудзецца нават стварэнне вечнага рухавіка.

3D-прынтары і робаты, цеплавізійная камера, а таксама мабільныя праграмы для дыстанцыйнага кіравання — ад Лодзінскага ўніверсітэта. Эка-дызайн і выяўленчае мастацтва на мяжы скульптуры і тэкстылю — ад Акадэміі выяўленчага мастацтва ў Лодзі.

Ні многа ні мала, а ўсё гэта ў адзін дзень. Праграма ўпісваецца ў традыцыю мультызадачнага мерапрыемства, дзе свой інтарэс знойдуць дарослыя і дзеці, фізікі і лірыкі, тыя, хто любіць журэк, і тыя, хто аддае перавагу флячкам. «Дзень Польшчы ў Мінску» прапануе далучыцца да польскіх традыцый, культуры і дасягненняў. Уваход на ўсе мерапрыемствы, вядома ж, вольны і чаканы.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ**

■ Афіша

# РАЗГЕРМЕТЫЗАЦЫЯ

## Білеты і праграма «ТЭАРТа» ўжо даступныя

**Тут тры мушкецёры, што прачнуліся ў нашы дні, атмасфера рэстарана Сайгона 1950-х і беларуская версія «Вяселля» літоўскага рэжысёра Оскараса Каршуноваса. VIII Міжнародны форум тэатральнага мастацтва абвясціў праграму, і яе геаграфія інтрыгуе — у Мінск прыедуць калектывы Паўднёвай Карэі, В'етнама, Фінляндыі, Польшчы, Літвы, Латвіі, Бельгіі, Францыі, Расіі.**

**А ў праграме Belarus Open, вядома ж, будуць паказаны найлепшыя беларускія пастаноўкі апошняга часу. Сёлета «ТЭАРТ» пройдзе з 20 верасня да 16 кастрычніка — расклад ужо даступны і продаж білетаў адкрыты.**



«Рэвізор» Мікалая Пінігіна.

Дзесяць пастановак у беларускай праграме, дзевяць — у міжнароднай. Куратар Belarus Open Людміла Грамыка адабрала работы рэжысёраў як старэйшага пакалення, так і гучных маладых аўтараў — атрымаўся, як звычайна, збор найярчэйшых беларускіх тэатральных пастановак за апошні час. Belarus Open увогуле выглядае фіналам пэўнага конкурсу, таму што, пакуль замежныя госці фэсту адкрываюць для сябе беларускі тэатр, беларусы могуць выкарыстаць праграму ў якасці спісу рэкамендацый і знаёміцца з ёй, калі пажадаюць.

Дык вось «ТЭАРТ» прапануе звярнуць увагу на і без таго аблашчанага «Рэвізора» Мікалая Пінігіна, які быў пастаўлены ў Купалаўскім на трасянцы і выклікаў хвалю абмеркаванняў. На фэсце будзе паказаны «Mann ist mann» паводле Бертольда Брэхта — без Аляксея Ляляўскага і мінскага Лялечнага тэатра ў беларускай панараме не абысціся. З Брэста прыедуць «Новая зямля» Якуба Коласа ад Аляксандра Янушкевіча і аўтарскі монаспектакль лідара «Троіцы» Івана Кірчука «Дарожка мая», створанага па матэрыялах беларускага фальклору і пастаўленага Аляксандрам Казаком.

Яўген Карняг стварае свае спектаклі ў працэсе работы з акцёрамі ў жанры фізічнага тэатра — і кожны аказваецца ўнікальным. У Belarus Open уключана адразу дзве пастаноўкі аднаго з самых вядомых беларускіх тэатральных рэжысёраў — «Сёстры Граі» і «Бетон». Заснаваныя на міфе аб багінях Фаркідах і на міфе аб Арфеі і Эўрыдыцы адпаведна.

«ТЭАРТ» рэкамендуе таксама праектны тэатр — дзве пастаноўкі, створаныя Цэнтрам візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «АРТ Карпарэйшн». «З вучылішча» Аляксандра Марчанкі пастаўлена па п'есе беларускага драматурга Андрэя Іванова, якая была намінавана на прэстыжную тэатральную прэмію «Залатая Маска». «Крыжовыпаходдзяцей» прадстаўляе творчасць «самага экстравагантнага рэжысёра сучаснасці» Юрыя Дзівакова.

Міжнародная праграма пакажа «дзевяць найбуйнейшых тэатральных пастановак сучаснасці», адабраных і запрошаных дырэктарам фестывалю Анжалікай Крашэўскай. Што прыемна, дык бачыць тут заўсёднікаў. Пастаноўкі Оскараса Каршуноваса трапляюць на «ТЭАРТ» пяты раз — гэтым разам тут будзе «Вяселле» паводле Бертольда Брэхта, прычым адаптаванае пад геаграфію паказа. У Санкт-Пецярбургу, напрыклад, жаніліся пад «ДДТ», нам жа давядзецца пабачыць, як пастаноўку актуалізуюць пад Мінск.

Яшчэ адзін пастаянны госць Цімафей Кулябін, вядомы расійскі тэатральны рэжысёр, прычым вядомы сваімі інтэрпрэтацыямі класікі, на будучым «ТЭАРЦе» пакажа чэхаўскіх «Трох сясцёр» на мове жэстаў.

Тэатр прызнаецца ў любві да кіно. У спектаклі «Проста кіназдымка» фінскага рэжысёра Крысціяна Смэдса вядучыя акцёры Венгрыі і Эстоніі будуць гаварыць пра кіно і глядзець сцэны з фільмаў на фоне раскіданага папкорна.

В'етнамцы, якія пераехалі ў Францыю і выявілі, што яе рэчаіснасць сумна адрозніваецца ад іх уяўленняў, будуць дзейнічаць у кампрадукцыйным спектаклі «Сайгон» у антуражы французскага рэстарана, які больш нагадвае В'етнам 1950-х.

Ад Паўночнай Карэі мы ўбачым харэаграфічную пастаноўку аб вандроўных музыкантах «Даркнэс Пумба». Яшчэ два харэаграфічныя спектаклі пакажа Польскі тэатр танца з Познані — *«Czterdzieści»* вядомага нарвежскага харэографа Джо Стромгрэна і пастаральную «Жатву» ў пастаноўцы Ігара Гашкоўскі і харэаграфіі Івоны Пасінськай.

Атос, Партос і Араміс апынуцца ў сучасным свеце ў пастаноўцы «Тры мушкецёры. На ўсход ад Вены» рэжысёра Вальтэрса Сіліса. З Бельгіі прыедзе палітычны трылер «Арктыка» з вандроўкай у 2025 год.

Нарэшце, «Школа ТЭАРТа» праводзе шэраг адукацыйных мерапрыемстваў, прысвечаных тэатральнаму мастацтву і індустрыі.

Расклад, апісанне пастановак, фатаграфіі са спектакляў і увогуле больш падрабязную інфармацыю аб будучым Міжнародным форуме тэатральнага мастацтва можна знайсці на сайце teart.by. Білеты раскупляюцца хутка.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ**

# НА СКРЫЖАВАННЯХ УСПАМІНАЎ

**Нашы сны, нібы доўгачаканыя або ўзніклыя раптоўна дарогі, пакідаюць пра сябе ўспаміны. А калі гэтых дарог у жыцці было столькі, што ўсіх не пералічыць, — успаміны перш за ўсё вядуць да пачатку самай першай дарогі — да нашай малой радзімы.**

Можна прыехаць здалёку да той хаты, дзе ты калісьці нарадзіўся. Можна ўбачыць і пазнаць сябра, якога шмат дзесяцігоддзяў не сустракаў. Нават можна ўспомніць, дзе пад бетонам сучаснай аўтастрады некалі бегла, хавалася ў траве твая першая сцежка...

Але часам толькі ў снах даступна перанесціся ў тое мінулае. Зноў пачуць далёкія галасы, наталіцца незабыўным водарам бэзу каля бацькоўскай хаты, убачыць на яе ганку дарагога табе чалавека.

Менавіта з-за гэтага (на маю думку) вядомы паэт, публіцыст Навум Гальпяровіч назваў сваю новую кнігу «На скрыжаванні сноў». У навелах і эсэ ён запрашае чытача разам прайсці дарогамі свайго юнацтва, пазнаёміцца з сябрамі, суседзямі, паглядзець на яго малую радзіму — тагачасны Полацк. Даверліва аўтар перадае чытачу свае ўражанні, расказвае пра першы жыццёвы досвед. Перакідваючы масткі ўспамінаў праз гады, са шчырай пачуццёвасцю разважае над маральнымі праблемамі жыцця. Убачанае ў Беларусі і на розных шыротах планеты перадае з дакладнасцю мастака-жывапісца.



Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ у час прэзентацыі сваёй новай кнігі ў мінскім Літаратурным музеі Максіма Багдановіча.

Днямі, выступаючы перад аматарамі паэзіі ў Вязынцы, Навум Гальпяровіч сказаў сваім паклоннікам, што яго ўсё больш прыцягвае праца над прозай. Пацвярджэнне гэтаму — кніга навел і эсэ «На скрыжаванні сноў». Аўтар звыш дзесяці паэтычных зборнікаў сабраў для сваёй новай кнігі прозу, адметную лірычнасцю вобразаў і багаццем моўнай палітры.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

*(Зборнік «На скрыжаванні сноў» выйшаў у Мінску ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.)*

## Андрэй ПРЫКАТЭНКА:

На сцэне

# «З творамі Шэкспіра мы знаходзімся ў небяспечным полі, бо яны перапісаны з нечых слоў»

**Купалаўскі тэатр запрасіў «моднага» расійскага рэжысёра Андрэя Прыкатэнку, разам з ім прыдумаў узяцца за шэкспіраўскую камедыю «Сон у летнюю ноч» і паабяцаў у верасні паказаць новую пастаноўку «Сон у купальскую ноч». З гледачамі вакол сцэны і выкарыстаннем сучасных тэхналогій. У спектаклі будуць задзейнічаны Павел Харланчук, Валянціна Гарцуева, Юлія Шпілеўская, Дзмітрый Есяневіч, Павел Паўлюць, Міхаіл Зуй ды іншыя акцёры. Пакуль ідзе падрыхтоўка да прэм'еры, мы сустрэліся з рэжысёрам, за плячыма ў якога праца ў Санкт-Пецярбургу, Маскве, Новасібірску, Рызе, і задалі некалькі пытанняў пра Шэкспіра, будучую пастаноўку і расійскі тэатр.**



***— Вы не ўпершыню прадстаўляеце на сцэне аўтарскую інтэрпрэтацыю класікі. Як упісаць Шэкспіра ў кантэкст сучаснага тэатра?***

— Мне падаецца, наша пастаноўка, хоць знешне яна і выглядае як інтэрпрэтацыя класікі, насамрэч куды больш класічная, чым многае з таго, што вы трымаеце перад сваім унутраным позіркам. Мы можам паспрабаваць аказацца ў 1601 годзе на адным з прадстаўленняў тэатра «Глобус», дзе працаваў Шэкспір, — напэўна, менавіта такі спектакль мы павінны лічыць «класічным». Першыя запісы шэкспіраўскіх п'ес з'явіліся толькі праз пятнаццаць гадоў пасля яго смерці — уяўляеце, якая крыўдная рэч. Больш за тое, у шэкспіраўскім тэатры тэкст заўсёды імправізуецца ледзь не напалову, то-бок акцёры, па сутнасці, кажуць «адсябяціну», дадаюць усё, што ўздумаецца, прыўносяць рэаліі сённяшняга часу. Калі ўчора нешта адбылося ў палітычным жыцці — сёння вечарам гэта адлюстроўваецца ў спектаклі. Як ставіць спектакль па п'есе Шэкспіра «класічна»? Напэўна, так, як гэтага хацеў Шэкспір. А калі ён дапускаў вялікую колькасць імправізацый, значыць, мы таксама павінны кіравацца гэтым. У «Глобусе" гледачы таксама сядзелі на сцэне, між іншым, гэта былі самыя дарагія месцы. Выкарыстанне сучасных тэхналогій — таксама прытрымліванне традыцый Шэкспіра, бо ён сказаў, што тэатр павінен быць актуальным і адлюстроўваць рэчаіснасць. Мы і адлюстроўваем.

***— Тэатр пазіцыяніруе будучы спектакль як «унікальны праект для беларускага тэатральнага мастацтва». Можна падумаць, што ў ім выкарыстоўваецца шмат мадэрновых, выключных, сучасных штук, не вельмі распаўсюджаных у тэатры ў цэлым.***

— Я лічу, тут няма нічога сучаснага — гэта звычайны традыцыйны спектакль. Будзе куды цікавей, калі вы так пра яго напішаце, паверце. Пра тое, што тут ёсць відэапраекцыя, сказалі ўсе. Напішыце, што гэта самы што ні ёсць традыцыйны шэкспіраўскі спектакль, зроблены па лякалах тэатра «Глобус», дзе Шэкспір быў пайшчыкам, драматургам і акцёрам.

***— Як вы даследавалі шэкспіраўскі тэатр тых часоў?***

— Ёсць вельмі дастойная кніжка амерыканскага даследчыка Шэнбаума «Шэкспір. Кароткая дакументальная біяграфія». У мяне ёсць цудоўны сябра Сярожа Радлаў — з вядомай літаратурна-тэатральнай фаміліі, унук перакладчыцы Шэкспіра і савецкага тэатральнага рэжысёра. Ён усё жыццё займаецца вывучэннем Шэкспіра, жыве ў Англіі, працуе на ВВС, ён шмат расказваў мне пра драматурга і падарыў кніжку санетаў са сваімі каментарыямі, з якіх можна скласці ўяўленне аб елізавецінскай эпосе. Потым на партале Arzamas ёсць цудоўныя лекцыі найбуйнейшага расійскага шэкспіраведа Праташэвіча, тут жа — лекцыі расійскага тэатральнага крытыка і таксама даследчыцы Шэкспіра Марыны Давыдавай. З усяго гэтага можна скласці хоць нейкае ўяўленне пра тое, што адбывалася ў шэкспіраўскім тэатры, і назаўсёды забыць пра «класічны» тэкст Шэкспіра. З гэтымі ведамі трэба паспрабаваць зразумець, што сваімі творамі, якія дайшлі да нас запісанымі праз некага, Шэкспір хацеў сказаць. Потым — гэта я ўжо пра сябе — пастарацца з нейкай павагай паставіцца да задумы аўтара, падумаць, як гэта адгукаецца ў маім сэрцы і сэрцы сучаснага чалавека, паспрабаваць сумясціць усе складаныя адчуванні і перадаць іх тэатральнымі сродкамі.

***— Што, на ваш погляд, Шэкспір хацеў сказаць камедыяй «Сон у летнюю ноч»?***

— З гэтай п'есай увогуле каламбур, таму што яна была напісана для вясельнага прадстаўлення. Акцёры тэатра «Глобус» былі прыдворнымі слугамі, іх трупа нават называлася «Слугі лорда-камергера». Часта ў іх абавязкі ўваходзілі выступленні перад знатнымі асобамі. У п'есе «Сон у летнюю ноч» мы можам знайсці сляды, я б сказаў, карпаратыўнага прадстаўлення. Тут ёсць цудоўная паэзія, бязмежны геній Шэкспіра, але сама канструкцыя выбудавана так, каб у канцы адбылася вясельная ўрачыстасць. У гэтым хаваецца нейкая драматургічная недасканаласць, бо ў драматургіі ёсць пэўныя законы, а тут яна падпарадкоўваецца крыху іншай логіці. Таму спектаклі па п'есе «Сон у летнюю ноч» крыху «кульгаюць», бо пастаноўшчыкі не да канца ўсё гэта разумеюць. А мы павінны ведаць, што ў выпадку з творамі Шэкспіра знаходзімся ў небяспечным полі, бо яны перапісаны з нечых слоў. Напрыклад, «Гамлет» быў запісаны са слоў артыста, які выконваў ролю Марцэла, — ён прадаў п'есу іншай трупе, за што быў звольнены. То-бок мы ведаем «Гамлета» са слоў артыста, які іграў у ім трэцярадную ролю.

***— Як вы працуеце з п'есай на беларускай мове?***

— Я дагэтуль гэтага не разумею. Я прыкладна ведаю, пра што ідзе гаворка, няма такога, каб я сядзеў і спрабаваў уцяміць, што сказаў акцёр. Мне гэта і не патрэбна. Спектакль на незнаёмай мове вы ўсё яшчэ можаце глядзець без перакладу, магчыма, нават, ён вам спадабаецца. Але толькі ў адным выпадку — калі вы і без мовы разумееце, што адбываецца. Па сутнасці, рэжысёр гэтым і займаецца, ён з мовай насамрэч так працуе — як бы між іншым. Рэжысёр — гэта падзейнасць, абставіны, тое, што адбываецца між людзьмі. У нейкай ступені няведанне мовы спрашчае работу рэжысёра, мне гэта нагадвае практыкаванне Станіслаўскага, які прапаноўваў паставіць перад сцэнай шкляную «чацвёртую сцяну», каб не чуць, што гавораць акцёры. Трэба было сыграць так, каб глядач усё роўна разумеў, што адбываецца.

***— Станіслаўскі яшчэ неяк дапамагае вам ставіць спектаклі? На сталé каля сцэны шмат — напэўна, вашых — запісаў.***

— Калі нас вучылі ў інстытуце, мы павінны былі абавязкова рабіць эксплікацыю. Увогуле гэта харошая штука — ты запісваеш мізансцэны, логіку персанажаў і гэтак далей. Я ў Пецярбургу рабіў спектакль з Алегам Валяр'янавічам Басілашвілі і Алісай Брунаўнай Фрэйндліх. У іх, як гэта і павінна быць, на першай рэпетыцыі быў сшытак з перапісанымі ад рукі ролямі. Уяўляеце? У рэжысёра таксама павінна быць эксплікацыя — раней я гэтым займаўся, пісаў цэлыя дакументы, але ў нейкі момант падумаў — не з-за ляноты, паверце, я не лянівы чалавек, — што рэжысёрская эксплікацыя мне перашкаджае. Калі ты загадзя ўсё прыдумваеш — пазбаўляеш сябе магчымасці адгукацца на факт рэальнымі адчуваннямі. Напрыклад, сустракаешся з артыстам, а ён жа — канкрэтны, напрыклад, высокі, у яго такі голас і такі склад характару. Лепш, калі задума будзе нараджацца ў момант прамаўлення тэксту, а не наадварот, інакш ты прыцягваеш акцёра да сваёй задумы. Я доўга вучыў сябе адштурхоўвацца ад жывога адчування. Можна яшчэ дзейнічаць наступным чынам. Ты разумееш, што ў цэбе ёсць шэраг тэм, напрыклад, у сюжэце ёсць чарадзейная кветка. Ты, як рэжысёр, павінен прыдумаць, як акцёр прыйдзе, капне сок у вочы і зачаруе, бо, калі ён зробіць гэта элементарна і пачне капаць нейкай фіцюлькай, — ніхто не заўважыць. Альбо з'яўленне прывіда ў «Гамлеце»: ён прыйдзе ў прасціне, будзе складацца з туману альбо прывідам будуць дзвесце чалавек. Ты прыдумваеш такія рэчы і атрымліваеш спіс тэм — тэма кветкі, тэма людзей, тэма эльфаў і гэтак далей. З гэтага можна скласці сімфонію. Музычны твор будуецца па такой жа логіці: калі мы разбяром сімфанічны твор — зразумеем, што ў ім перамешваецца некалькі тэм.



Рэпетыцыі спектакля «Сон у купальскую ноч».

***— У расійскай тэатральнай сферы часам здараюцца гучныя прэцэдэнты. Вы звязаны з новасібірскім тэатрам. Ці засталі вы сітуацыю, калі некалькі гадоў таму пастаноўка Цімафея Кулябіна «Тангейзер» была забаронена з-за пратэсту вернікаў?***

— Мне вельмі шкада, што гэтая гісторыя выклікала істэрыю рэлігійных фанатыкаў. Мастацтва павінна кіравацца наборам нейкіх правілаў і нормаў: прытрымлівацца крымінальнага заканадаўства, не заклікаць да звяржэння ўлады, не паказваць боль дзяцей. А ўсё астатняе — ужо наша асабістая справа. Калі некаму не падабаецца пастаноўка — ён можа яе не глядзець. У гісторыі сумны працяг, цудоўны дырэктар Новасібірскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета Барыс Мездрыч быў звольнены, дагэтуль не мае працы. З-за гэтага прэцэдэнту пэўным людзям стала здавацца, што яны могуць умешвацца ў творчы працэс. Потым прайшла яшчэ цэлая хваля ўмяшанняў. Гэта складанасці часу, у які мы жывем.

> **«Калі мы з вамі паглядзім на спіс мастацкіх акцый «Гогаль-цэнтра» за кароткі тэрмін яго існавання — то будзем узрушаны, гэта вялізная работа».**

***— Ёсць прэцэдэнты і больш актуальныя, як арышт тэатральнага і кінарэжысёра Кірыла Сярэбранікава.***

— Трэба разумець, што грошы, якія быццам украдзены, былі выкарыстаны на стварэнне каласальнай мастацкай з'явы, якой сёння з'яўляецца «Гогаль-цэнтр». Я сам быў на спектаклі «Сон у летнюю ноч», за «адсутнасць» якога інкрымінуецца крадзеж выдаткаваных на яго дзяржаўных сродкаў. Следства павінна паказаць — магчыма, яны хацелі выплаціць не ўсе падаткі, але каб стварыць больш мастацкага прадукту. Калі мы з вамі паглядзім на спіс мастацкіх акцый «Гогаль-цэнтра» за кароткі тэрмін яго існавання — то будзем узрушаны, гэта вялізная работа. Што такое крадзеж? Калі чалавек забірае для сябе. А ў названай гісторыі такога не было.

***— Вам падаецца, гэтыя прэцэдэнты датычацца выключна сферы тэатра?***

— Усё ўзаемазвязана, мы жывём у вельмі няпросты час, хоць у гісторыі чалавецтва не было простых часоў. Расія пасля шоку свабоды, якую яна атрымала з развалам Савецкага Саюза, знаходзіцца ў зоне рэфлексіі да нейкіх традыцыйных нормаў. У 1990-я гады, пры ўсёй складанасці і крымінальнасці, людзі былі амаль абсалютна свабодныя. У іх не было, напрыклад, прапаганды, увогуле нічога, да чаго грамадства спрадвеку прызвычаілася. Зараз узнікае рэфлексія да традыцыйных, імперскіх каштоўнасцяў, таму нехта з такім энтузіязмам выступае са сваімі ініцыятывамі, як у выпадку з «Тангейзерам». Таму гэта няпросты час, і тэатр яго адлюстроўвае.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ
## о повторных торгах

Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего ЧТУП «Карго плюс» (УНП 390431147).

Номер лота, вид выставляемого на торги имущества: Лот № 1, объект: седельный тягач.

Наименование, начальная цена, место нахождения: Volvo FH12, 1995 года выпуска, зелено-серого цвета, рег. знак. АЕ14942, начальная цена – 14706,40 рубля, место нахождения – г. Орша, ул. 2-я Береговая, 10.

Лот № 2, объект: бортовой полуприцеп.

Наименование, начальная цена, место нахождения: Schmitz SPR24, 1994 года выпуска, черно-зеленого цвета, рег. знак. АА22722, начальная цена – 2685,60 рубля, место нахождения – г. Орша, ул. 2-я Береговая, 10.

Имеющиеся обременения в отношении имущества – не имеется.

Место, дата и время проведения торгов: г. Орша, ул. А. Островского, 36, каб. 12; 3 сентября 2018г. в 11.00.

Справочная информация: Маханькова Анастасия Александровна, заведующий сектором, тел. 8 (0216) 543212, 8 (033) 6161412, отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши, адрес: ул. А. Островского, 36, г. Орша, адрес электронной почты opi217@minjust.by.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 31 августа 2018 г. на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши № BY22AKBB36429030007942200000, УНН 300002505, филиал № 215 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Орша, код AKBBBY21215.

Величина первого шага составляет 5 процентов от начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).

В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем).

## Уважаемые акционеры ОАО «МАПИД»

**14 августа 2018 года** состоится внеочередное общее собрание акционеров **ОАО «МАПИД»,** расположенного по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205. Собрание созывается по инициативе наблюдательного совета ОАО «МАПИД».

**Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205 (зал заседаний).**

**Начало работы собрания – 14 августа 2018 года, 15.00.**

**Повестка дня:**

О выплате дивидендов за I полугодие 2018 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 7 августа по 13 августа 2018 года по месту нахождения Общества г. Минск, ул. Р. Люксембург,205, каб. № 208А (производственный отдел собственного строительства УКС) с 9.00 до 16.00, 14 августа 2018 года – по месту проведения собрания с 9.00 до 14.30.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного на 4 августа 2018 года.

Регистрация участников собрания с 13.30 до 14.30 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

акционеру общества – паспорт;

представителю акционера – паспорт и доверенность.

**УНП 100008115**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Минский мясокомбинат» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **торгового помещения с инвентарным номером 500/D-70782710, общей площадью 698,2 кв. м, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, д. 15-3Н.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **2 500 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 250 000,00 бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330 000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение результативного аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **04.09.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.09.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 422/С-3647 (назначение – здание специализированное для органов государственного управления, обороны, государственной безопасности, внутренних дел, наименование – казарма), общей площадью 2033,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Островского, 35; капитальное строение, инв. № 422/С-27534 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – сооружение благоустройства к зданию № 35), общей площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Островского, сооружение благоустройства к зданию № 35; зеленые насаждения (береза, каштан)

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425850100004000123, площадью 0,3077 га (назначение – для содержания и обслуживания здания казармы) по адресу: г. Щучин, ул. Островского, 35

Начальная цена продажи – 161 508 руб. (сто шестьдесят одна тысяча пятьсот восемь рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 16 150 руб. (шестнадцать тысяч сто пятьдесят рублей)

ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 422/С-51434 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание сепараторной), общей площадью 223,0 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, а. г. Василишки, ул. Советская, 69А

Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425881301602000556, площадью 0,3085 га (назначение – для обслуживания здания сепараторного отделения) по адресу: Щучинский р-н, а. г. Василишки, ул. Советская, 69А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, площадью 0,3085 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадью 0,0047 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадью 0,0444 га

Начальная цена продажи – 20 108,40 р. (двадцать тысяч сто восемь рублей сорок копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 2 010 р. (две тысячи десять рублей)

Продавец – Открытое акционерное общество «Щучинский маслосырзавод», 231513, г. Щучин, ул. 17 Сентября, 45, тел. 8 01514 280-03

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32

Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 4 сентября 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 29 августа 2018 г. до 15.00**

*Телефон для справок 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

## Дополнение к рекламному объявлению от 25 июля 2018 г.

ООО «БелИнвестОценка» уведомляет о том, что проведение открытого аукциона по продаже объектов открытым акционерным обществом «Белорусский цементный завод» состоится 24.08.2018 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 62, оф. 910. С более подробной информацией можете ознакомиться в выпуске газеты «Звязда» за 25 июля 2018 года или у Организатора аукциона: +375 (17) 398-29-44, +375 (29) 615-40-08, e-mail: belinvo@tut.by

УНП 191692351

## РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 4 сентября 2018 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже имущества – крана башенного КБ-408, принадлежащего Открытому акционерному обществу «СП-Строй» на праве собственности

| № лота | Наименование, краткая характеристика объекта | Начальная цена, рублей (в т. ч. НДС по ставке 20 %) | Задаток, рублей (в т. ч. НДС по ставке 20 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Кран башенный КБ-408** (инв.№338), заводской номер 770, год выпуска 1991. Предназначен для проведения грузоподъемных работ при строительстве сооружений высотой до 57,8 м. с массой монтируемых элементов до 10 т | **25 080,00** | **2 508,00** |
| **Местонахождение имущества: г. Гомель, ул. Могилевская, 26** | | | |
| **Шаг аукциона – 5 %** | | | |

Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 09.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 03.09.2018 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **4 сентября 2018 г**.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; индивидуальный предприниматель – паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором аукциона; представитель индивидуального предпринимателя – паспорт и доверенность; представитель юридического лица (резидент РБ) – паспорт (руководитель – копию приказа, протокола о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидент РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY84ALFA30122305700080270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе по лоту № 1 согласно извещению в газете «Звязда» от 4 августа 2018 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (единственным участником, выразившим согласие купить Объект), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (единственным участником, выразившим согласие купить Объект), Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие купить объект) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере четырех процентов от цены продажи Объекта, сформированной в установленном порядке; в течение 10 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (единственным участником, выразившим согласие купить Объект) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объекта, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи Объекта.

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. Тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95 • www.gino.by • e-mail: auction-gino@gino.by**

**Продавец: ОАО «СП-Строй», г. Гомель, ул. Рабочая, 16. Тел.: 8 (029) 608-15-74; 8 (0232) 59-17-56**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении Ушачским районным исполнительным комитетом конкурса на предоставление в аренду рыболовных угодий, расположенных на территории Ушачского района Витебской области

| № лота | Наименование предмета торгов | Площадь, га | Тип, класс, категория | Направление деятельности | Месторасположение рыболовного угодья | Срок аренды, лет | Сумма ежегодной арендной платы, рублей | Сумма задатка в размере 20 % от суммы ежегодной арендной платы, рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Право аренды озера Матырино | 149,5 | Лещево – щучье – плотвичный | Ведение промыслового рыболовства и организации платного любительского рыболовства | 6 км на север от г. п. Ушачи, у дер. Матырино | 25 | 732,55 | 146,51 |

ОРГАНИЗАТОР – Ушачский районный исполнительный комитет, 211524, Витебская область, г. п. Ушачи, ул. Ленинская, д. 12, контактный телефон (02158) 2 78 75, факс 2 70 05, интернет-сайт ushach.rshp@tut.byАРЕНДОДАТЕЛЬ – Витебский областной исполнительный комитет, 210010, г. Витебск, ул. Гоголя, д. 6, контактный телефон (0212) 35 93 32.

1. Конкурс состоится 11 сентября 2018 г. в 14.00 по адресу: 211524, Витебская область г. п. Ушачи, ул. Ленинская, д. 12, каб. 63.

2. Для участия в конкурсе приглашаются юридические лица. Участникам конкурса не позднее 30 августа 2018 г. необходимо в адрес организатора предоставить следующие документы:

заявление, в котором указываются сведения о рыболовных угодьях, которые участник конкурса желает получить в аренду по результатам конкурса.

К заявлению прилагаются:

– комплексный план использования рыболовных угодий (далее – комплексный план), разработанный в соответствии с требованиями к его содержанию и форме, установленными Советом Министров Республики Беларусь, или его копия, запечатанные в отдельном конверте;

– письменные предложения участников конкурса о выполнении условий конкурса, запечатанные в отдельном конверте. При этом данные предложения являются окончательными и не могут уточняться в ходе проведения конкурса;

– копия платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение задатка;

– доверенность представителя участника конкурса и копия документа, подтверждающего его личность (в случае, если заявление подписывается не руководителем участника конкурса), либо копия документа, подтверждающего полномочия руководителя участника конкурса.

3. Документы, необходимые для участия в конкурсе, принимаются организатором конкурса по адресу: 211524, Витебская область, г. п. Ушачи, ул. Ленинская, д. 12, каб. 63 с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 в рабочие дни.

4. Последний день приема документов – 5 сентября 2018 г. до 17.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

5. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в конкурсе на расчетный счет: главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Витебской области № BY 28AKBB36003280019300000000, открытый в ЦБУ № 211 г. п. Ушачи филиала № 216 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Полоцк, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04004.

6. Конкурс проводится в порядке, определенном Правилами ведения рыболовного хозяйства и рыболовства, утвержденными Указом Президента Республики Беларусь от 8 декабря 2005 г. № 580 «О некоторых мерах по повышению эффективности ведения охотничьего хозяйства и рыбохозяйственной деятельности, совершенствованию государственного управления ими», Положением о порядке проведения конкурса по предоставлению в аренду рыболовных угодий фонда запаса, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 29 декабря 2017 г. № 1044.

7. Победителем конкурса считается участник, который представит лучшие предложения по выполнению условий конкурса, которые должны отвечать следующим требованиям:

– создание не менее трех новых рабочих мест;

– обеспечение среднемесячной заработной платы работникам, осуществляющим промысловое рыболовство и охрану рыболовных угодий, не менее установленного законодательством размера минимальной заработной платы;

– обустройство, в течение 1 года со дня заключения договора аренды рыболовных угодий, мест отдыха для рыболовов в количестве не менее 3 (на каждом из них обеспечение наличия не менее чем по 1 единице: малых архитектурных форм (беседок размером 2*3 м, кострища, туалета, контейнера для мусора);

– поставка рыбы в торговую сеть Ушачского района или реализация ее с торгового места на рынке г. п. Ушачи в количестве не менее 15 процентов от квоты на вылов рыбы;

– оборудование причала, лодочной станции, прокат орудий рыболовства, маломерных судов в течение 1 года со дня заключения договора аренды рыболовных угодий;

– предоставление льготных условий для осуществления платного любительского рыболовства для зарегистрированных по месту жительства граждан в населенном пункте Матырино Ушачского района;

– предложения по осуществлению иных мероприятий по обустройству или оказанию услуг, направленных на развитие платного любительского рыболовства.

8. Организатор конкурса вправе отказаться от его проведения не позднее, чем за 30 дней до начала проведения конкурса. Участник конкурса имеет право до наступления даты проведения конкурса письменно отозвать заявление.

9. Конкурс проводится при наличии заявлений двух и более участников.

В случае если заявление подано только одним участником и его предложения соответствуют условиям конкурса, заключение договора аренды рыболовных угодий осуществляется с этим участником конкурса на предложенных им условиях.

Участникам конкурса, не признанным победителями конкурса, задаток возвращается исполнительным комитетом в течение пяти рабочих дней после даты проведения конкурса.

Победителю конкурса, его единственному участнику, сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору аренды рыболовных угодий, заключаемому по результатам конкурса, при плате за рыболовные угодья.

10. Возмещение исполнительному комитету затрат на организацию и проведение конкурса, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам конкурса документации, необходимой для его проведения, осуществляется победителем конкурса, его единственным участником. Размер такого возмещения не должен превышать суммы фактических затрат на организацию и проведение конкурса, изготовление документации, необходимой для его проведения.

Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения будет доведена до сведения участников конкурса до начала их проведения.

11. Контактная информация секретаря комиссии по организации и проведению конкурса по предоставлению в аренду рыболовных угодий фонда запаса: Михаль Людмила Михайловна, тел. 8 (02158) 2 78 75, эл. почта ushach.rshp@tut.by адрес: 211524, г. п. Ушачи, ул. Ленинская, 12, каб. 61



# ЗЯМЛЯ ЧЫСТЫХ

## Куды рушыць Пакістан?

**Цэнтрысцкая партыя «Тэхрык-е-Інсаф» («Рух за справядлівасць») на чале з колішнім капітанам зборнай Пакістана па крыкеце Імранам Ханам стала пераможцай на ўсеагульных выбарах, атрымаўшы 116 з 272 месцаў у Нацыянальнай Асамблеі (ніжняй палаце парламента) краіны. Следам ідзе «Пакістанская мусульманская ліга», якая мае 64 мандаты. На трэцім радку апынулася левацэнтрысцкая «Пакістанская народная партыя» з 43 крэсламі. Паколькі ніводнае палітычнае аб'яднанне не атрымала простай большасці ў парламенце, партыі праводзяць перагаворы аб стварэнні кіруючай кааліцыі, якая ў далейшым сфарміруе новы ўрад краіны. Прыход апазіцыі да ўлады ў Пакістане мае каласальнае значэнне для рэгіёна, дзе цяпер рэгулярна сутыкаюцца інтарэсы Кітая і ЗША. Прафесійнага гульца ў крыкет і вядомага крытыка Амерыкі Імрана Хана аддзяляюць ад пасады прэм'ера толькі працэдурныя фармальнасці. Дарэчы, ён ужо абвясціў, што 11 жніўня мае намер прынесці прысягу ў якасці новага кіраўніка ўрада. Куды ж рушыць Пакістан?**

### АД АРЫЯЎ ДА ЯДЗЕРНАЙ ЗБРОІ

Крыху «навігацыі». Ісламская Рэспубліка Пакістан («пакістан» у перакладзе з мовы урду — «зямля чыстых») — дзяржава ў Паўднёвай Азіі. Абмываецца водамі Аравійскага мора на поўдні, мяжуе з Іранам на паўднёвым захадзе, Афганістанам на паўночным захадзе і поўначы, Кітаем на паўночным усходзе і Індыяй на ўсходзе. Пакістан — шостая па колькасці жыхароў краіна ў свеце (з насельніцтвам 207,7 мільёна чалавек, паводле даных перапісу мінулага года) і другая (пасля Інданезіі) — па колькасці мусульманскага насельніцтва.

У III-II тысячагоддзях да н. э. на гэтай тэрыторыі быў цэнтр адной з найстаражытнейшых цывілізацый у гісторыі чалавецтва — Харапскай. У II тысячагоддзі да н. э. тэрыторыю Пакістана засялілі арыі. У выніку паходаў Аляксандра Македонскага ўзмацніўся ўплыў элінскай культуры. Пасля тут утварылася магутнае Кушанскае царства — першы ачаг распаўсюджвання будызму. Пасля тут пачынаецца распаўсюджванне ісламу. У XIII ст. тэрыторыя ўваходзіць у склад Мангольскай імперыі.

У XIX стагоддзі тэрыторыя сучаснага Пакістана была захоплена англійскімі войскамі і ўключана ў склад Брытанскай Індыі. Адным з духоўных заснавальнікаў сучаснай краіны лічыцца паэт Мухамад Ікбал, кіраўнік Мусульманскай Лігі. Менавіта ён прапанаваў у 1930 годзе стварыць незалежную мусульманскую дзяржаву. Назву для яе яшчэ ў 1933-м прапанаваў студэнт-мусульманін Чаўдхуры Рахмат Алі, які вучыўся ў Кембрыджы. Такім чынам з'явіўся акронім, утвораны з назваў гісторыка-культурных рэгіёнаў: «П» — Пенджаб, «А» — Афгані, «К» — Кашмір, «С» — Сіндзі, а «тан»— Белуджыстан. У 1947 годзе пры падзеле Брытанскай Індыі ўтварылася суверэнная дзяржава Пакістан, у якую ўвайшлі паўночна-ўсходнія і паўночна-заходнія раёны Індастана пераважна з мусульманскім насельніцтвам.

У 1990-х адбываецца актыўнае развіццё ядзернай праграмы краіны (стартавала яшчэ ў 1972-м) пад начальствам Абдулы Кадзір Хана, што стала прычынай увядзення ЗША санкцый супраць Пакістана. Як сцвярджаюць ваенныя эксперты, у канцы XX стагоддзя ў Ісламабадзе было да дзесяці ядзерных зарадаў на аснове ўрану і да пяці — на аснове збраевага плутонію. Вынікам інтэнсіўнай працы на працягу трох дзесяцігоддзяў сталі выпра-



баванні ядзернай зброі на палігоне Чагаі ў правінцыі Белуджыстан на мяжы з Афганістанам. Цяпер Пакістан — адзіная краіна ісламскага свету, якая мае ядзерную зброю.

Да таго жварта мецъ на ўвазе тое, што з пачатку 2000-х гадоў паўночна-заходні рэгіён дзяржавы Вазірыстан з'яўляўся апорай руху «Талібан». У 2004-м талібы захапілі тут фактычную ўладу. Праўда, пасля тэракта 11 верасня 2001 года Пакістан афіцыйна спыніў падтрымку рэжыму талібаў і падтрымаў актыўныя дзеянні ЗША супраць гэтага руху.

### ТАТАЛЬНАЯ ПЕРАМОГА

Падчас цяперашняй выбарчай кампаніі партыя Імрана Хана заваявала шмат месцаў не толькі ў парламенце, але і ў правінцыйных асамблеях. Гэта рэдкае дасягненне для Пакістана. Галоўны заклік Хана — рэфармаваць сістэму кіравання, якая ў значнай ступені заснавана на сетках патранажу і асабістых сувязяў. Галасы яму прынёс лозунг барацьбы з карупцыяй, нацэлены супраць дзвюх палітычных дынастый — Шарыфа і Бхута (адпаведна «Пакістанская мусульманская ліга» і «Пакістанская народная партыя»). Перамога Хана, на думку экспертаў, сімвалізуе стомленасць краіны ад палітычных і эканамічных крызісаў.

Як заўважыла ng.ru старшы навуковы супрацоўнік Інстытута ўсходазнаўства РАН Наталля Замараева, «Партыя справядлівасці параўнальна маладая, ёй каля дваццаці гадоў. Гэта азначае, што праходзіць змена палітычных эліт». І ў Пенджабе, найбуйнейшай правінцыі, дзе пражывае 53 працэнты насельніцтва краіны, Хан заваяваў амаль палову месцаў у правінцыйным сходзе. «Гэта азначае, што патэнцыйна ён мае магчымасць сфарміраваць урад не толькі ў цэнтры, але і ў найбуйнейшай правінцыі. Гэта татальная перамога», — лічыць эксперт.

### СТАЎКА НА МАЛАДЫХ

Перадвыбарчая кампанія 65-гадовага Імрана Хана была арыентавана на маладых выбаршчыкаў — у 208-мільённым Пакістане 64 працэнты насельніцтва маладзейшыя за 30 гадоў. Пры гэтым краіна вельмі кансерватыўная. Падчас кампаніі Хан часта выкарыстоўваў антыамерыканскую і антыіндыйскую рыторыку. Ён таксама абяцаў перамагчы карупцыю. Гэта адна з найцяжэйшых праблем краіны. Справа дайшла да таго, што Наваз Шарыф, які ўзначальваў урад яшчэ летась (а ўвогуле тройчы знаходзіўся на пасадзе прэм'ера), быў асуджаны на 10 гадоў за фінансавыя махінацыі, якія дазволілі яго сям'і набыць раскошную нерухомасць у Лондане.

Выбаршчыкі звязваюць з Імранам Ханам надзеі на паляпшэнне сітуацыі ў эканоміцы, абцяжаранай знешнім доўгам, а таксама ўмацаванне грамадскай бяспекі. У ходзе перадвыбарчай кампаніі і саміх выбараў у краіне адбыўся шэраг тэрарыстычных нападаў. Падчас саміх выбараў бяспеку на выбарчых участках ахоўвала 371 тысяча салдатаў — амаль у пяць разоў больш, чым на выбарах 2013-га. Агульную ж колькасць сіл бяспекі, прыцягнутых для аховы выбараў, паліцыя ацаніла ў 800 тысяч чалавек.

Імран Хан абяцаў «новы Пакістан». «Я прадстаўлю сістэму, прызначаную для мас, — уся палітыка будзе для людзей», — заявіў ён, абвяшчаючы аб сваёй перамозе. Палітык таксама паабяцаў не пераязджаць у афіцыйную рэзідэнцыю прэм'ер-міністра, заявіўшы, што яна будзе «ператворана ў навучальную ўстанову ці нешта ў гэтым родзе». «Мне было б сорамна жыць у такім вялікім доме», — сказаў ён.

У гэтай прамове Імран Хан зрабіў прымірэнчую заяву аб Індыі. Акрамя таго, ён заклікаў да «ўзаемавыгадных» і «збалансаваных» сувязяў з саюзнікам Пакістана ЗША і паабяцаў стварыць рабочыя месцы для бедных. Вядучы саветнік у амерыканскім універсітэце Джона Гопкінса, у мінулым — дырэктар афганскага і пакістанскага напрамкаў у Белым доме, Шаміла Чаўдхары адзначыла ў артыкуле для часопіса Time, што пакуль Вашынгтон бачыць у Пакістане «праблему, якую трэба вырашаць, а не краіну, з якой варта будаваць дыялог». Пры гэтым эксперт называе самога Хана «пакістанскім Трампам» і адзначае, што паміж палітыкамі ёсць нямала паралеляў — абодва многія гады былі ў свеце шоу-бізнесу, не займалі па-



літычных пасад. Дарэчы, у тым, якое паміж імі падабенства і якія адрозненні, Трамп і Хан неўзабаве могуць пераканацца асабіста, калі сустрэнуцца ў верасні ў Нью-Ёрку на пасяджэнні Генеральнай асамблеі ААН.

### ХАН ЦІ ПРАПАЎ

Пакінуўшы крыкет — адзін з самых папулярных відаў спорту ў Пакістане, — Хан актыўна займаецца палітыкай з 1996 года. Ён стаў адным з найбольш папулярных палітыкаў у краіне, яго мітынгі нязменна збіралі тысячы прыхільнікаў. Праўда, з тых часоў, як яго фота з'яўлялася ў гламурных часопісах, а паклоннікі палявалі на яго аўтограф, сам Хан змяніўся. «У свеце Імран Хан па-ранейшаму вядомы як чэмпіён па крыкеце, які прывёў Пакістан да перамогі на чэмпіянаце свету 1992 года. Аднак з тых часоў ён стаў паслядоўнікам кансерватыўнага ісламу і нядаўна ажаніўся са сваёй духоўнай настаўніцай, якая хавае твар пад чадрой», — піша The Guardian.

Частка прыхільнікаў Хана, якія прытрымліваюцца менш радыкальных поглядаў, адвярнулася ад яго з-за нядаўніх заяў, у якіх ён абараняў юрыдычную сістэму руху «Талібан». Пасля гэтых выказванняў экс-спартсмен нават атрымаў мянушку «Талібан Хан».

Акрамя таго, праціўнікі Хана таксама абвінавачваюць яго ў тым, што ён дабіўся перамогі пры дапамозе пакістанскіх вайскоўцаў, і адкрыта называюць яго крэатурай пакістанскіх сілавікоў. Хоць у новага прэм'ера, у адрозненне ад яго папярэднікаў, ёсць багатае мінулае ў выглядзе знаёмстваў са знакамітасцямі і ўплывовымі людзьмі, ён у любым выпадку будзе залежаць ад генералаў, лічаць эксперты. «Пакістанскія вайскоўцы, якія прывялі Хана да ўлады, хочуць вярнуць свае інвестыцыі», — згадвае gazeta.ru меркаванне вядучага эксперта Gulf State Analytics у Вашынгтоне Тэадора Карасіка. Эксперт таксама нагадвае, што многія пакістанскія прэм'еры не змаглі доўга ўтрымацца ва ўладзе.

Як адзначае gazeta.ru, сам Хан, падобна, добра разумее агульны расклад. У аўтабіяграфічнай кнізе «Пакістан. Асабістая гісторыя», апублікаванай у 2011 годзе, ён згадвае пра гэта. «Пакістан — гэта краіна, дзе палітыка заўсёды была гульнёй для злачынцаў і ахвотных незаконна ўзбагачацца, і любы, хто кіне выклік гэтаму статус-кво, нават чалавек з маёй папулярнасцю, — можа быць арыштаваны», — піcаў палітык.

### ТРЫНАЦЦАТЫ КРЭДЫТ

Як стала вядома, новы ўрад Пакістана мяркуе звярнуцца ў Міжнародны валютны фонд па самую вялікую крэдытную лінію ў гісторыі краіны — ад $10 млрд да $12 млрд, піша The Financial Times са спасылкай на інфармаваныя крыніцы. План будзе прадстаўлены Імрану Хану неўзабаве пасля яго ўступлення на пасаду прэм'ер-міністра. Пакістан перажывае валютны крызіс, і знешняя дапамога можа забяспечыць выхад з яго. Паводле апошніх даных, валютныя рэзервы пакістанскага цэнтрабанка скараціліся да $9 млрд, гэтай сумы не хапае нават для таго, каб забяспечыць бесперабойны імпарт у краіну на працягу двух месяцаў пры захаванні бягучых аб'ёмаў.

Крэдыт МВФ стане ўжо трынаццатым для Пакістана. Апошні раз гэтая краіна звярталася ў МВФ у 2013 годзе, тады яна атрымала $5,3 млрд. Пакістан актыўна карыстаецца дапамогай Паднябеснай: у мінулым фінансавым годзе Ісламабад атрымаў ад кітайскіх камерцыйных банкаў крэдыты на $5 млрд.

**Захар БУРАК.**



### Экспрэс-навіны

## 35 ТЫСЯЧ АМАТАРАЎ БЕГУ

**Столькі ўдзельнікаў сёлета чакаюць арганізатары Мінскага паўмарафона.**

Кіраўнік Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзім Дзевятоўскі адзначыў, што летась на старты выйшлі 30 тыс. чалавек, цяпер можна казаць аб сур'ёзным павялічэнні колькасці ахвотных — рэгістрацыя ідзе больш актыўна. Ён сказаў, што паўмарафонскую дыстанцыю — 21 км — ужо выбралі ў два разы больш людзей, чым год таму. Пашыраецца і геаграфія ўдзельнікаў — сёлета ў Мінск прыедуць прадстаўнікі як мінімум 40 краін.

У гэтым годзе Мінскі паўмарафон пройдзе чацвёрты раз. 9 верасня старт галоўнай дыстанцыі (21,1 км) будзе дадзены ў 9.00. Забегі на дыстанцыях 5,5 км і 10 км пачнуцца ў 12.00. Спаборніцтвы маюць бронзавы лэйбл Міжнароднай федэрацыі лёгкай атлетыкі, а таксама пяць зорак якасці і бяспекі забегаў Еўрапейскай лёгкаатлетычнай асацыяцыі. Па традыцыі бегавы маршрут пракладзены па самым цэнтры беларускай сталіцы, удзельнікі спаборніцтваў змогуць убачыць найпрыгажэйшыя месцы горада. На час забегаў рух транспарту будзе перакрыты.

## У БЕРЛІН АДПРАВЯЦЦА 38 БЕЛАРУСАЎ

**Яны прадставяць краіну на чэмпіянаце Еўропы па лёгкай атлетыцы.**

Самым дасведчаным у складзе беларускай каманды будзе кідальнік молата — двухразовы чэмпіён свету, прызёр двух Алімпіяд Іван Ціхан, якому нядаўна споўнілася 42 гады. На мінулым чэмпіянаце Еўропы ў Амстэрдаме ён стаў уладальнікам сярэбранага медаля. Балельшчыкі таксама разлічваюць на паспяховыя выступленні Аліны Талай, Эльвіры Герман (100 м з бар'ерамі), Хрысціны Ціманоўскай (100 м, 200 м), Вольгі Мазуронак (марафон), Карыны Таранды, Максіма Недасекава (скачкі ў вышыню), Тацціны Халадовіч (кіданне дзіды) і іншых беларускіх атлетаў.

Кантынентальнае першынство ў нямецкай сталіцы стане 24-м па ліку. Спаборніцтвы пройдуць на Алімпійскім стадыёне з 6 па 12 жніўня, спартсмены разыграюць 48 камплектаў узнагарод. Чакаецца, што за медалі паспрачаюцца больш за 1600 атлетаў з 50 краін Старога Свету ■

**Трыста гадзін сам-насам з небам: дзяўчына-пілот расказвае пра верталётны спорт і ваенную авіяцыю**

# «У ПАВЕТРЫ Я АДЧУВАЮ СЯБЕ ДОМА»

**На мінулых выхадных пад Мінскам прайшоў чэмпіянат свету па верталётным спорце. 34 экіпажы з 7 краін спаборнічалі ў выкананні чатырох практыкаванняў: «Навігацыя», «Паралельны палёт на дакладнасць», «Паралельная развозка грузаў» і «Паралельны слалам». Выступалі там, вядома, і беларускія верталётчыкі, у тым ліку жаночыя экіпажы. Мы сустрэліся з камандзірам аднаго з іх — Сафіяй КУРШУБАДЗЭ, каб даведацца пра гэты від спорту больш і зразумець, як дзяўчаты ўлюбляюцца ў неба.**

***— Сафія, колькі гадоў вы за штурвалам?***

— У паветры стаж вылічаецца лётнымі гадзінамі. Бывае, чалавек шмат гадоў у авіяцыі, а налёт у яго параўнальна невялікі. Я дзяржаўны лётчык-спартсмен, таму мой налёт залежыць ад фінансавання, якое дае дзяржава, і ад магчымасцяў аэраклуба, у якім я лятаю. Калі лічыць у гадах, то за штурвалам я 9-ы год, а калі ў лётных гадзінах, то ў мяне больш за 300 гадзін. Сярэдні налёт — гэта 30 гадзін у год, прыкладна так лётаюць ваенныя лётчыкі. Хацелася б, вядома, больш, але калі ўлічыць, што лятаем мы не круглы год, а толькі з вясны па восень, гэта добрыя лічбы.

***— Адкуль узнікла захапленне авіяцыяй?***

— Я вучылася ў кадэцкім корпусе, на адным з пастраенняў камандзір давёў інфармацыю, што мінскі аэраклуб ДТСААФ праводзіць набор лётчыкаў-спартсменаў у верталётнае і самалётнае звенні. Патрабаванні адбору былі простыя — добрая паспяховасць і здароўе, таму што медыцынскую камісію любы пілот праходзіць кожныя паўгода. Мэтай гэтага набору было падрыхтаваць юнакоў і дзяўчат для паступлення ў Ваенную акадэмію. На месцы прэтэндавалі каля 100 чалавек, у верталётнае звяно ўзялі толькі 5, у тым ліку і мяне.

Потым усё змянілася, з нашай лётнай групы толькі адзін хлопец (самы малодшы) паступіў у акадэмію. У мой год не было набору, таму працягнула лятаць як спартсмен ДТСААФ. А калі вайсковая акадэмія аднавіла набор дзяўчат, мой узрост ужо перавысіў дапушчальны для паступлення. Была вельмі засмучаная, таму што заўсёды хацела, каб мая праца была лётнай. Зараз я працую ў Беларускай федэрацыі авіяцыйнага спорту, гэта блізка, але яна ўсё ж такі наземная.

***— Калі б адвучыліся ў акадэміі, трапілі б у ваенную авіяцыю. Сёння ў Беларусі там ёсць дзяўчаты?***

— Так, адна — Наталля Лазько. Ёй у свой час пашанцавала: яна на адзін год старэйшая за мяне, і ў год яе паступлення якраз быў набор у Ваенную акадэмію. Калі Наташа, будучы яшчэ курсантам, прыйшла на практыку да нас у аэраклуб, я ўжо на той момант лятала. Памятаю, як гаварыла з ёй пра першы самастойны вылет, як расказвала пра выдатных інструктараў і запэўнівала, што ёй няма чаго баяцца і ўсё атрымаецца! Наташа стала лятаць са мной апэратарам, разам выканалі першы спартыўны разрад. Сёння яна — старшы лейтэнант, дыпламаваны спецыяліст з запісам «Пілот верталёта».

***— Ведаю, што ад сваёй мары вы проста так не адмовіліся...***

— Я стукалася ва ўсе дзверы: і ў авіяцыю МНС прасілася, і ў войска, гатовая была кінуць другі раз інстытут. Першы раз я паступіла на авіядыспетчара, думала, як добра, прафесія блізкая да лётнай, але, калі стала вучыцца, зразумела, што гэта проста мазахізм. Я не магу сядзець і глядзець, як іншыя лятаюць. Так, ты імі кіруеш, але ты сядзіш на зямлі. У мяне проста сэрца разрывалася. У канцы першага курса з бюджэту дзённага аддзялення сышла. Знаёмыя казалі, што вар'ятка, але я разумела, што так не змагу. Другі раз паступіла на юрыдычную спецыяльнасць у Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце, гэтая сфера мне таксама заўсёды была цікавая. Калі спрабавала перавесціся ў Ваенную акадэмію, нічога не выйшла зноў з-за ўзросту, хоць я гатовая была ўсё пачаць спачатку, з першага курса і разумела, што пяць з паловай гадоў мне давядзецца быць «закрытай» у акадэміі: гэта ўсё ж такі армія. На жаль, нават вялікія ваенныя начальнікі не змаглі мне дапамагчы, справа дайшла да міністра абароны.



***— Чым можна растлумачыць такое імкненне ў ваенную сферу, у тым ліку ў кадэцкі корпус?***

— У дзяцінстве я марыла, як тады казалі, аб «міры ва ўсім свеце». Марыла працаваць у міліцыі, мне хацелася, каб у турме сядзелі толькі тыя, хто гэтага сапраўды заслугоўвае, а абранне падобнай меры стрымання для невінаватых было маім сапраўдным болем. Думала, вось я прыйду — і ўсё зменіцца. Калі трапіла ў кадэцкі корпус, зразумела, што свет уладкаваны інакш, пасталела за кошт гэтага таксама раней, бо «кадэтка» гэта не школа, дзе заўсёды знаходзішся пад мамчыным крылом. Акрамя ўсяго іншага, знаходзячыся ў корпусе, для сябе я знайшла авіяцыю і, прыйшоўшы сюды, зразумела, што гэта маё. У паветры мне спакойна, камфортна, я адчуваю сябе дома, у мяне няма клопатаў, праблем, гэта ўсё застаецца на зямлі. Калі ляціш, табе проста няма калі думаць пра гэтыя рэчы, ты застаешся сам-насам з небам, атрымліваеш задавальненне, атрымліваеш асалоду ад прыгажосці і пачуццё супакаення.

***— Як праходзіла знаёмства з авіяцыяй?***

— Тэарэтычнае навучанне доўжылася паўтара года. Толькі потым нас пасадзілі ў верталёт, інструктар даў патрымацца за ручку кіравання, тады я наогул не разумела, што адбываецца, што за прыборы, куды глядзець, мне кажуць: «Трымай курс!» — а я не разумею, што з гэтага курс. Знаходзілася ў такой прастрацыі, але гэта было выдатна. У нас было вельмі шмат дысцыплін і тэхнічных, і вывучэння дакументацыі. Дарэчы, залікі мы здаём і цяпер кожны год, толькі пасля гэтага дапускаюць да палётаў.

***— Чула, што многія пілоты лічаць верталёт адушаўлёным.***

— Так і ёсць, я шчыра ў гэтым перакананая. Мы лятаем на адным і тым жа тыпе, але кожная машына мае свой характар, яны розныя ў кіраванні, па-рознаму табе падпарадкоўваюцца і рэагуюць пры ўздзеянні на органы кіравання. Калі ты не знойдзеш з верталётам агульную мову да палёту, то ўсё выйдзе не так гладка і чыста. Мне падабаецца, калі мы ў тандэме з машынай, калі становімся адзіным арганізмам, тады тэхніка цябе слухаецца, атрымліваецца прыгожы палёт. Ты мякка, акуратна пілатуеш, не даводзіцца яго «ламаць». Мы заўсёды стараемся пагладзіць верталёт ручкай, павітацца, пагаварыць, агледзець, гэта нават не традыцыя, а, хутчэй, неабходнасць.

***— Як ацэніце чэмпіянат свету, які завяршыўся напярэдадні?***

— Мы выступалі ў чатырох практыкаваннях. Першае не атрымалася, таму што я была вельмі загружаная па працы, гэта цалкам мая віна, не змагла своечасова выключыцца і настроіцца на палёт. А калі казаць увогуле, то ацэньваю наша выступленне добра, зрабілі гэта бяспечна і прыгожа, не падвялі каманду, паказалі не максімум, але блізка да гэтага. Пасля практыкаванняў падыходзілі суддзі і казалі: «Так прыгожа зайшлі на дах, мы спачатку думалі, што гэта хлопцы пряляцелі, а аказалася вы. Такія малайцы!»

***— Верталётны спорт — гэта заўсёды дуэт, экіпаж, вы выступаеце з апэратарам Настассяй Караткевіч.***

— Мы лятаем разам чацвёрты сезон. Гэта не шмат, тым больш улічваючы той факт, што мы абедзве пачыналі з нуля і, калі садзіліся ў пару, былі маладымі спартсменкамі (я пачала лятаць па спорце на два гады раней за Насцю). Хаця ў нашым відзе прынята, каб нехта адзін у экіпажы быў ужо дасведчаным. У першы наш агульны сезон у 2015 годзе на чэмпіянаце Беларусі занялі 4-е месца ў навігацыі, у 2016-м у жаночым мнагабор'і выйгралі «серабро», гэта добрыя вынікі.

***— Як можна размеркаваць вашы ролі?***

— У экіпажы павінна быць адзінства, размовы аб тым, хто важнейшы і галоўнейшы, выключаны. Насця — мае вочы і вушы, я мозг, які збірае разам усе каманды, што яна дае, і пасылае імпульс нашаму целу — верталёту. Інакш кажучы, я кірую верталётам праз тыя сігналы, якія яна бачыць і перадае. Напрыклад, 2 метры ўгору, 20 см наперад, налева. Я павінна выконваць гэта дакладна. Калі яна мяне нясвоечасова спыніла ці я пачынаю займацца самадзейнасцю, тады нічога не атрымліваецца.

***— Гэта значыць паміж людзьмі павінен быць высокі ўзровень даверу?***

— Па сутнасці, яна даверае мне сваё жыццё, я гэтую адказнасць адчуваю. Разумею, што ў паветры адказваю не толькі за сябе і тэхніку, але і за Насцю, у тым ліку перад яе блізкімі.

***— Небяспечныя сітуацыі ў вас у небе былі?***

— Звычайна пілоты пра гэта не любяць казаць, і я не выключэнне. У нас з Насцяй былі сітуацыі, калі ты прылятаеш, садзішся і проста маўчыш, таму што разумееш, што зараз мы ёсць, а яшчэ секунды таму ўсё магло скончыцца паіншаму. У кожным палёце трэба заставацца з халоднай галавой. Сэрца гарачае, таму што ты любіш гэтую справу, а мозг усё ж такі трэба пастаянна трымаць у тонусе. Ты павінен дакладна ведаць, як рэагаваць у небяспечнай сітуацыі.

***— Дзе вы адчуваеце сябе больш упэўнена: на зямлі або ў паветры?***

— Камфортней у любым выпадку ў паветры. А празмерная ўпэўненасць там — гэта лішняе, таму што, калі ты будзеш лічыць сябе шыкоўным пілотам, які ўсё можа, абавязкова што-небудзь здарыцца. Гэта проста закон жыцця.

***— Калі незнаёмыя людзі даведваюцца, што вы пілот, дзівяцца?***

— Усе па-рознаму рэагуюць, некаторыя не разумеюць, пра што я наогул кажу, як дзяўчына можа кіраваць верталётам. Некаторыя захапляюцца. Я не спрабую камусьці штосьці даказаць. Спачатку, калі выкідвала фатаграфіі ў сацыяльныя сеткі, нават незнаёмыя людзі асуджалі мяне, я перажывала, а потым навучылася не рэагаваць на меркаванні збоку. Наогул, сёння ў Беларусі не так шмат жанчын, якія лятаюць, я думаю, недзе каля 15 чалавек.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

■ Легенды спорту

# Ірына СУМНІКАВА: «Я ЖАДАЛА Б УСІМ ТАКОГА СПАРТЫЎНАГА ЖЫЦЦЯ»

## Як 32 гады таму на паркеце ў Палацы спорту запалілася зорка алімпійскай чэмпіёнкі



**Маладзёжны чэмпіянат свету па баскетболе, які ў нядзелю завяршыўся ў Мінску, сабраў многіх зорак. Тут мы ўбачылі і алімпійскіх чэмпіёнаў, ураджэнцаў Беларусі Івана Ядэшка, Таццяну Белашапку, Алену Швайбовіч і Ірыну Сумнікаву. З апошняй карэспандэнту «Звязды» ўдалося пагаварыць не толькі аб баскетболе.**

Лёс Ірыны Сумнікавай можна назваць унікальным. Нарадзіўшыся ў Мінску, яна заваявала свет вялікага спорту сваім разумным баскетболам. Стаўшы «першай скрыпкай» у зборнай СССР, спартсменка ўдзельнічала ў чатырох Алімпійскіх гульнях, стала чэмпіёнкай Барселоны-92 і бронзавым прызёрам Сеула-88. Яе сям'ю можна назваць па-сапраўднаму адметнай, бо родны брат Ірыны Георгій Свірыдзенка (гэта дзявочае прозвішча Сумнікавай) з'яўляецца алімпійскім чэмпіёнам па гандболе, а Ірына Уладзіміраўна сёння — адзіная жанчына — камісар ФІБА.

### Усё пачыналася з танцаў

У сям'і Свірыдзенкаў усе дзеці былі захопленыя спортам, старэйшы брат Ірыны Вітольд — боксам, малодшы Георгій — гандболам, а вось сама Іра, спазніўшыся па ўзросце на гімнастыку і фігурнае катанне, якімі хацела займацца, пачала з фальклорнага ансамбля і хору. Толькі да сваіх дзесяці гадоў яна прыйшла ў плаванне, а потым і ў лёгкую атлетыку. Неўзабаве высокую дзяўчынку забралі ў баскетбол. Дарэчы, першым сур'ёзным клубам для Сумнікавай стаў дубль мінскага «Гарызонта», які трэнераваў тады будучы настаўнік нацыянальнай зборнай Беларусі яшчэ малады спецыяліст Анатоль Буяльскі.

У дублі Ірына не затрымалася, ужо праз паўгода дзяўчына гуляла ў камандзе майстроў пад кіраваннем вядомага Сямёна Халіпскага. Сямён Львовіч апісваў маладую падапечную як незаменнага гульца. *«Іра лёгка і хутка перамяшчаецца, умее прадбачыць сітуацыю, перахопліваць «мёртвыя» мячы, мае асаблівае чуццё ў розыгрышы».* А пазней да сваіх слоў Халіпскі дадасць: *«Многія гады ў СССР не было такога разумнага гульца. Мабыць, і ў агляднай будучыні не прадбачыцца. Ніхто не можа так цудоўна наладзіць на пляцоўцы ўзаемадзеянне з цэнтравымі і нападаючымі, арганізаваць пачатак атакі. Гэта — дар Божы».*

У «Гарызонце» Ірына Сумнікава правяла 12 гадоў, стала яго капітанам, менавіта на гэты час прыйшліся найлепшыя гады існавання клуба.

### Гаспадыня на пляцоўцы

Свой шлях да зборнай Савецкага Саюза Сумнікава, тады яшчэ Свірыдзенка, пачала з юніёрскай зборнай, дзе паказала сябе як выдатнага, надзейнага гульца. У «дарослую» зборную Яўген Якаўлевіч Гомельскі запрасіў Ірыну ў 1984 годзе. *«Па амплуа я — разыгрываючая, гэта пазіцыя, якая патрабуе пэўнага гульнявога інтэлекту і ў пэўнай ступені даволі адзінкавая, таму я, новенькая, нават сярод старажылаў зборнай магла адчуваць сябе ўпэўнена»*, — успамінае Ірына Уладзіміраўна. Гомельскі лічыў яе сваёй правай рукой, часта прыгаворваючы: *«Запомні: ты гаспадыня на пляцоўцы. Ты фарміруеш гульню, але да цябе і асаблівыя патрабаванні».*

Першым «дарослым» дасягненнем Ірыны са зборнай СССР стала перамога на XIII Летняй Універсіядзе — 1985 у Кобэ (Японія). Затым — «серабро» чэмпіянату свету 1986 года.

Падрыхтоўка да Алімпійскіх гульняў 1988-га пачалася за паўгода да старту. Гэтая Алімпіяда ў Сеуле па эмоцыях стала самай запамінальнай у кар'еры, адзначае Ірына Уладзіміраўна. *«Мы праходзілі вар'яцкі адбор, і я нарэшце трапіла ў склад, у тых самых 12 чалавек. Для мяне гэта было вялікае дасягненне, таму што паўгода мы адбіраліся, паўгода не ведалі, хто паедзе ў Сеул. А першы раз на Алімпійскіх гульнях — гэта заўсёды такое захапленне, прытым такая незвычайная азіяцкая краіна,* — адзначае Сумнікава. — *Там у нас атрымалася толькі «бронза», і, можа быць, гэта нават добра, бо потым было да чаго імкнуцца. Далей ты ўжо мэтанакіравана працуеш чатыры гады, таму што ведаеш, што ты ў складзе, гэта заўсёды прасцей. Пасля першай Алімпіяды засталіся вельмі добрыя ўражанні, напэўна, таму пасля яе ў мяне было яшчэ трое Гульняў».*



Пасля пройгрышу ў 1988-м ЗША і Югаславіі зборная СССР заваявала два «золаты» на чэмпіянатах Еўропы. На Алімпіядзе-1992 у Барселоне сітуацыя паўтарылася — у паўфінале сустрэліся зборныя СНД і ЗША, Ірына Сумнікава ў гэтым матчы зарабіла восем ачкоў, што дапамагло аб'яднанай камандзе выйсці ў фінал. Вырашальны матч з кітаянкамі быў у разы складанейшы. *«Вядома, гэта была самая лепшая Алімпіяда. І жыццё пасля яе змянілася, званне чэмпіёнкі абавязвае, яго трэба горда несці,* — расказвае Ірына Уладзіміраўна. — *У Барселону мне патэлефанавалі з Германіі і прапанавалі кантракт, таму працяг маёй кар'еры як прафесійнага гульца быў ужо там. Потым я з'ехала ў Венгрыю, потым у Расію, у прынцыпе за званне алімпійскай чэмпіёнкі мяне і запрашалі ў гэтыя клубы, таму трэба было апраўдваць давер і кожны раз даказваць, што мы не проста так сталі першымі».*

Пасля развалу СССР і Алімпіяды-1992 дакументы Ірыны Сумнікавай апынуліся ў Міжнародным алімпійскім камітэце. *«Нам трэба было вызначацца са спартыўным грамадзянствам,* — успамінае баскетбалістка. — *Першым, хто патэлефанаваў мне, аказаўся расійскі трэнер, таму што я ў яго гуляла, і прапанаваў выступаць за зборную Расіі. Каманда Беларусі тады, напэўна, была яшчэ на стадыі планавання, пазней з радзімы мне таксама патэлефанавалі, але я ўжо дала згоду расіянам».* Ніякіх крыўдаў паміж спартсменкай і роднай краінай як тады, так і цяпер не ўзнікла.

На чэмпіянаце свету 1995 года зборная Расіі стала толькі трэцяй, на Алімпіядзе ў Атланце зусім пятай. Тады Ірына Сумнікава, будучы ўжо вопытнай баскетбалісткай, праводзіла на пляцоўцы па 40 хвілін.

Алімпіяда-2000 у Сіднеі аказалася для яе апошняй, «першая скрыпка» ў аркестры, якая задавала тон на пляцоўцы на працягу чатырох алімпійскіх цыклаў (менавіта так тады пісалі пра яе журналісты), згуляла там усяго адзін матч. У гульні з Кубай яе «прыбралі» з турніру ўдарам у твар: кубінка Марыя Леон локцем зламала Ірыне скулавую костку. *«Было балюча. Але я ж не ведала, наколькі гэта сур'ёзна, выйшла на пляцоўку ў другім тайме. Над брывом узнік здаравенны сіняк, але з гарачкі падумала, што ўсякае бывае, перацярплю. Толькі потым здымкі паказалі, што костка зламаная. У дадатак з-за галавакружэння я ўпала і атрымала пералом запясця»*, — успамінала Ірына. Сёння яна сцвярджае, што тая, апошняя для яе, Алімпіяда ўсё роўна не пакінула дрэнных успамінаў. *«Адзінае, што зборная Расіі тады магла паказаць лепшы вынік, а так для спартсмена траўма — гэта нармальная з'ява. Я потым аднавілася і гуляла яшчэ чатыры гады за маскоўскае «Дынама», больш за тое, магла паехаць і на наступную Алімпіяду ў Афіны»,* — кажа Сумнікава.

Апошнім яе міжнародным турнірам быў паўфінал чэмпіянату Еўропы 2001 года, а вось у фінале яна ўжо не ўдзельнічала.

### Мы яшчэ гуляем у баскетбол

У мінулым годзе зборная, якая выйграла Алімпіяду ў Барселоне, адзначыла 25 гадоў з той знакавай падзеі. Трэнер Яўген Якаўлевіч Гомельскі зрабіў свята для ўсёй каманды, прыехалі ўсе 12 чалавек, якія тады выходзілі на пляцоўку. *«Хтосьці зараз жыве ў Францыі, хтосьці ва Украіне, але ўсе з'ехаліся. Пра нас зрабілі фільм, прымалі ў Міністэрстве спорту, дарылі падарункі. Праз 25 гадоў усе мы яшчэ гуляем у баскетбол, а ў мяне наогул працяг спартыўнай кар'еры — гэта зноў баскетбол, таму я як бы нікуды і не сыходзіла. Баскетбол назаўжды, баскетбол — гэта маё жыццё»,* — з зіхатлівай усмешкай дзеліцца Ірына Уладзіміраўна.

Пасля завяршэння кар'еры яна і не думала пра тое, каб пакідаць спорт. Спачатку паспрабавала сябе ў трэнерскай дзейнасці, аднак, як вядома, не заўсёды вялікі спартсмен можа вырасці ў такога ж трэнера. Як прызнаецца сама Ірына, пасля завяршэння кар'еры яна ператварылася з байца ў сентыментальную жанчыну, таму часта шкадавала гульцоў, ішла на саступкі, што часам непрымальна для трэнера. *«Пазней у расійскай федэрацыі баскетбола мне прапанавалі ўзначаліць аддзел зборных камандаў, потым у ФІБА здала экзамены на міжнароднага камісара і стала працаваць у Міжнароднай федэрацыі,* — расказвае гераіня. — *Вось так усё адно за адно чаплялася, атрымліваецца, нават задумацца не было калі, што можна абраць у жыцці нейкі іншы напрамак. Можа, гэта і добра. Калі шмат думаеш, пачынаюць усякія думкі блукаць, кідае то ўлева, то ўправа».*

Сёння Ірына Сумнікава застаецца адзінай жанчынай — камісарам ФІБА.

**Біяграфічная даведка**

Ірына Сумнікава нарадзілася ў Мінску ў 1964 годзе.
Чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў 1992 года.
Бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў 1988 года.
Удзельніца АГ-1996 (5-е месца) і 2000 (6-е месца).
Чэмпіёнка Еўропы — 1989, 1991 гадоў.
Бронзавы прызёр ЧЕ-1995, 1999.
Сярэбраны прызёр ЧС-1986.
Чэмпіёнка Расіі — 2000, 2001 гадоў.
Прызёр чэмпіянату Венгрыі 1998, 1999, 2000 гадоў.

**Клубная кар'ера**

Гарызонт (Мінск) (1980—1992).
Обергаўзен (Германія) (1992—1994).
Пошта (Шапрон, Венгрыя) (1994—1996).
BSE (Будапешт, Венгрыя) (1996—2000).
БК «Дынама» — Масква (2000—2003).

### Машына часу

Нягледзячы на тое, што алімпійская чэмпіёнка ўжо даўно жыве ў Маскве, яна часта прыязджае ў родную Беларусь, каб наведаць сваякоў, сяброў і знаёмых. На чэмпіянаце свету ў Мінску Ірына выконвала ролю камісара, аднак пасля кожнай гульні можна было назіраць яе цёплыя сустрэчы са знаёмымі. *«Пабачыцца прыйшлі ўсе, з кім я гуляла па розных узростах. І наша дырэктар школы Рэгіна Ігнацьеўна Пышнік, ёй 80 ужо будзе налета. Гэта такая добрая гісторыя, я жадала б усім такога спартыўнага жыцця. Мне і з трэнерамі пашанцавала, заўсёды добрыя былі людзі, ёсць што ўспомніць, а самае галоўнае, што тут на такім жа чэмпіянаце свету ў гэтым жа Палацы спорту ў 1986 годзе я гуляла сама»*, — з настальгіяй успамінае Ірына.

Гледзячы на гульню лідараў чэмпіянату, яна разам з Рэгінай Ігнацьеўнай успамінае былыя часы. *«Вядома, баскетбол зараз змяніўся, але, як і раней, спартсменкі павінны быць вельмі моцнымі фізічна, вынослівымі,* — расказвае дзейны камісар ФІБА. — *Гульня стала больш мабільнай, таму што змяніліся правілы, у нас яны былі больш зацяжныя, таму мы больш гулялі ў пазіцыйны баскетбол, а цяпер з-за хуткіх 24 секундаў баскетбол больш індывідуальны. Калі работала камісарам на гульні ЗША — Кітай, падумала, як жа гэтыя амерыканскія дзяўчаты падобныя на мяне, гэта ж мне сказала і Рэгіна Ігнацьеўна, і, ведаеце, мне адразу захацелася вярнуцца».*

### Трэба проста пачакаць

Размаўляючы з вядомай баскетбалісткай, мы не маглі не абмеркаваць тэму беларускага баскетбола, а менавіта нацыянальнай жаночай зборнай, для якой зараз не самыя простыя часы. *«Змена пакаленняў — гэта заўсёды балюча,* — кажа Ірына. — *Трэба пацярпець і пачакаць, прыйдзе час. Вельмі добра, што вы ўзялі гэты чэмпіянат свету, у маладых дзяўчат з'явілася магчымасць убачыць рознасць камандаў, іншы баскетбол, прылаўчыцца да яго, каб у будучыні ў нацыянальную зборную прыйшлі новыя гульцы без страху. Думаю, дзякуючы падтрымцы дзяржавы, федэрацыі баскетбола, усіх людзей, якія да гэтага маюць дачыненне, мы ўбачым добрую зборную Беларусі, трэба проста пацярпець год, два. Наш Гомельскі трываў чатыры гады, пакуль мы выйгралі. Гэта заўсёды цяжка, таму жадаю вам поспеху!»*

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «СЧАСТЛИВЫЙ СЛУЧАЙ» В ОСТРОВЕ ЧИСТОТЫ! ТУР 4»

**1. Сведения об организаторе.**

Общество с ограниченной ответственностью «Торговая компания Ромакс» (Далее – Организатор).

УНП 190761848. Зарегистрирован решением Минского горисполкома от 04.10.2006 г. № 2011. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 190761848.

Местонахождение Организатора: 220068, г. Минск, ул. Каховская, д. 70А, пом. 8.

Почтовый адрес: 220068, г. Минск, ул. Каховская, д. 70А, пом. 8 (5-й этаж).

**2. Наименование Рекламной игры.**

«**Счастливый случай в Острове чистоты! Тур 4**».

**3. Территория проведения.**

Дискаунтеры «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь и интернет-магазины «Остров чистоты» zht.by, zhs.by, zhi.by.

**4. Сроки проведения.**

06.08.2018 г. – 01.10.2018 г. (включая период розыгрыша и вручения призов).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**

Председатель:

1. Смаль Арина Олеговна, ООО «Торговая компания Ромакс», маркетолог.

Члены комиссии:

1. Масюк Алексей Викторович, ООО «ЗападХимСервис», специалист по рекламным коммуникациям.

2. Немкевич Екатерина Анатольевна, ЧТУП «ЗападХимТорг», маркетолог.

3. Стасюк Евгений Владимирович, ООО «ЗападХимИнвест», специалист по рекламным коммуникациям.

4. Ширинова Ольга Францевна, ООО «Торговая компания Ромакс», начальник отдела ВЭД.

**6. Перечень продукции, участвующей в Игре.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж товаров, реализуемых в дискаунтерах «Остров чистоты» и интернет-магазинах «Остров чистоты» zht.by, zhs.by, zhi.by, с условием обязательной покупки как минимум одного из «Товаров-счастливчиков» торговых марок «Gliss Kur», «Groshik», «Bagi», «Dove», «Savex», «Sorti», «Pampers», «Sun Energy», «Panthenol», «Lady Caramel», «Ozone», «i-Fresh», указанных в Приложении 1, за исключением табачных изделий, некоторых видов детского питания (Приложение 2).

**7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Рекламной игры.**

Участниками Рекламной игры могут стать физические лица – граждане Республики Беларусь, а также лица, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, достигшие 18 лет, выполнившие условия участия в Рекламной игре.

К участию в Рекламной игре не допускаются члены комиссии.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

Для участия в Игре необходимо:

7.1. В период с 06.08.2018 г. по 18.08.2018 г. совершить покупку в любом магазине «Остров чистоты» или на сайте интернет-магазина zht.by, zhs.by, zhi.by на сумму не менее 10 (десять) белорусских рублей в одном чеке любых товаров, включая не менее 1 (одного) «Товара-счастливчика» согласно перечню товаров (Приложение 1), за исключением табачных изделий, некоторых видов детского питания (Приложение 2), применив на кассе торгового объекта «Остров чистоты» при расчете за покупку дисконтную карту, либо ввести номер дисконтной карты в личном кабинете в разделе «дисконтная карта» до завершения оформления заказа в интернет-магазине zht.by, zhs.by, zhi.by.

7.2. В период с 06.08.2018 г. по 18.08.2018 г. достоверно заполнить персональные данные и подтвердить согласие на участие в Рекламной игре на Интернет-сайте ostrov-shop.by (либо проверить корректность ранее заполненных данных), а именно:

– фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (если такое имеется);

– адрес пребывания, проживания в Республике Беларусь: область (желательно), район (желательно), населенный пункт (обязательно), улица (обязательно, при наличии), дом (обязательно), корпус (обязательно при наличии), номер квартиры (обязательно, при наличии);

– адрес электронной почты (желательно);

– абонентский номер мобильного телефона белорусского оператора сотовой связи участника в международном формате (обязательно);

– оператор сотовой связи velcom, МТС, life:).

В случае если Персональные данные и согласие на участие в рекламных мероприятиях было подтверждено ранее, повторное подтверждение не требуется.

Игровые коды присваиваются с первого разряда (0000001, 0000002, 0000003 и т. д.) автоматически по порядку.

Каждому покупателю, который впервые совершил действия, указанные в п. 7.1 и п. 7.2 настоящих Правил, присваивается следующий после последнего присвоенного Игровой код на дату и время регистрации на интернет-сайте.

Каждому покупателю, который совершил повторные действия, указанные в п. 7.1 и п. 7.2 настоящих Правил (и который прошел прежде регистрацию на интернет-сайте), присваивается порядковый Игровой код по дате и времени покупки.

Присвоенные Игровые коды отображаются в диалоговом окне личного кабинета интернет-сайта в течение 3 (трех) суток после присвоения.

Участник получает один Игровой код за каждые полные 10 (десять) белорусских рублей в чеке, который содержит не менее 1 (одного) «Товара-счастливчика» (например, за 50 (пятьдесят) белорусских рублей в чеке, который содержит не менее 1 (одного) «Товара-счастливчика») участник получает пять Игровых кодов).

Если в чеке присутствуют табачные изделия и некоторые виды детского питания (Приложение 2), то их стоимость при присвоении Игровых кодов исключается.

Каждый участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии соблюдения установленных условий Рекламной игры.

**8. Состав и размер призового фонда. Источники формирования.**

Источником формирования призового фонда является имущество и денежные средства Организатора. Общий размер призового фонда составляет: 77 936,00 (семьдесят семь тысяч девятьсот тридцать шесть) рублей с НДС и включает следующие призы:

| № п/п | Наименование | Кол-во, шт. | Цена за ед., бел. руб. с НДС | Всего, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | А/м Skoda Rapid Active 1.6MPi/81 kW, AG, седан, цвет – Белый, кузов № XW8AC2NH8JK128485, РФ | 1 | 27810,45 | 27810,45 |
| | и денежное вознаграждение | 1 | 4137,35 | 4137,35 |
| 2 | Планшет SAMSUNG SM-T385NZKASER, черный | 10 | 522,00 | 5220,00 |
| | и денежное вознаграждение | 10 | 59,77 | 597,70 |
| 3 | Сотовый телефон SAMSUNG SM-G965F/DS титан | 5 | 2089,98 | 10449,90 |
| | и денежное вознаграждение | 5 | 294,07 | 1470,35 |
| 4 | Сотовый телефон SAMSUNG SM-G965F/DS черный брил. | 5 | 2089,98 | 10449,90 |
| | и денежное вознаграждение | 5 | 294,07 | 1470,35 |
| 5 | Денежный приз в размере 300 белорусских рублей | 50 | 300,00 | 15000,00 |
| | и денежное вознаграждение | 50 | 26,60 | 1330,00 |

**9. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры.**

Розыгрыш призов состоится 23 августа 2018 года в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Стороженская, 15, первый этаж.

**9.1. Порядок проведения розыгрыша.**

Для проведения розыгрыша используются лототрон, состоящий из 7 секций, каждая из которых соответствует определенному разряду Игрового кода, и несколько наборов шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9. Определение выигрышных Игровых кодов получателей призов происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из секций лототрона. Розыгрыш начинается с первого разряда слева.

За ходом розыгрыша призов следит комиссия по проведению Игры. Итоги розыгрыша призов Игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

Призовой фонд разыгрывается в обратной последовательности, указанной в п. 8.

**10. Срок и способ информирования участников, выигравших призы, место, порядок и сроки выдачи призов.**

Участники-победители, выигравшие призы, будут уведомлены о выигрыше посредством почты и телефонного звонка до 30 августа 2018 года включительно.

Победители могут получить призы при предъявлении паспорта (вида на жительство и т. п. документов, подтверждающих личность победителя и/или его доверенного лица при предъявлении соответствующей доверенности), по предварительной договоренности в офисе Организатора по адресу: г. Минск, ул. Каховская, 70а, пом. 8, с 30 августа по 1 октября 2018г. с 10.00 до 16.00 в рабочие дни, а также 1 сентября 2018 г. и 15 сентября 2018 г. с 10.00 до 15.00.

Организатор удерживает из суммы денежной части призов сумму подоходного налога победителя в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

В случае отказа победителя от получения приза или неполучения приза в установленные сроки и в установленном порядке, победитель теряет право на получение приза, и приз данного победителя остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

Выплата денежного эквивалента стоимости приза или замена его на другой приз не допускается.

Участники Игры, претендующие на получение призов, обязуются: заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, предоставить Организатору необходимые сведения. В случае невыполнения указанного условия Организатор имеет право отказать в выдаче призов.

Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения и заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором и связанные с получением приза.

Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения данной Рекламной игры.

Все права, в т. ч. исключительные имущественные права на такие интервью и результаты съемки, будут принадлежать Организатору.

**11. Название печатного средства массовой информации, в котором будут опубликованы результаты розыгрыша призового фонда, а также сроки их опубликования.**

Настоящие правила подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

Результаты подлежат опубликованию в газете «Звязда» до 30.08.2018 года.

**12. Общие условия Рекламной игры.**

Принимая участие в Рекламной игре, участник подтверждает свое ознакомление и согласие с Правилами и со всеми условиями участия в Рекламной игре.

Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Рекламной игры, а также результаты проведения Рекламной игры будут считаться окончательными и будут распространяться на всех участников.

Информацию об условиях участия и проведения Рекламной игры можно получить по телефонам «горячей линии» (8044) 700-13-33, (8033) 686-37-37 с 10.00 до 17.00, а также на сайте ostrov-chistoty.by.

**Приложение 1**

| Наименование |
|---|
| Бумажные пакетики для бутербродов GROSHIK, 10 см*21см, 50 шт. |
| Губка для мытья деликатных поверхностей GROSHIK, 1 шт. |
| Губка для мытья посуды GROSHIK жесткая, 3 шт. |
| Губка для посуды металлическая спиральная GROSHIK, 1 шт. |
| Губки для посуды GROSHIK, 10 шт. |
| Губки для посуды GROSHIK, 5 шт. |
| Губки для посуды металлические GROSHIK, 3 шт. |
| Губки для посуды пластиковые GROSHIK, 3 шт. |
| Губки для посуды профилированные GROSHIK, 3 шт. |
| Пакетики для замораживания продуктов с клипсами GROSHIK, 2 Л *25 шт. |
| Пакетики для приготовления ледяных шариков GROSHIK, 252 шарика |
| Пакеты для мусора GROSHIK, 35 л, 50 шт. |
| Пакеты для мусора GROSHIK, 60 л, 20 шт. |
| Пакеты для мусора GROSHIK с ручками, 35 л, 15 шт. |
| Пакеты для мусора GROSHIK с ручками, 60 л, 10 шт. |
| Перчатки резиновые GROSHIK, в ассортименте |
| Пленка полиэтиленовая для хранения продуктов GROSHIK, 30м*29 см, рулон |
| Салфетка GROSHIK для мытья стекол и зеркал, микрофибра, 30 см*30 см, 1 шт. |
| Салфетка для уборки GROSHIK кухни и ванны, микрофибра, 30 см*30 см, 1 шт. |
| Салфетки для уборки, вискозные, 35*35 см GROSHIK, 3 шт. |
| Салфетки для уборки, губчатые, 19*15,5 см GROSHIK, 3 шт. |
| Универсальные салфетки GROSHIK для уборки, 50 см*34 см, 10 шт. |
| Фольга алюминиевая GROSHIK, 10м*28 см, рулон |
| Фольга алюминиевая GROSHIK, 20м*28 см, рулон |
| Bagi АКРИЛАН СПРЕЙ 400 мл |
| Bagi ШУМАНИТ ОТ ЗАСОРОВ 70 г шоубокс |
| Bagi ШУМАНИТ СПРЕЙ 270 мл |
| Bagi ШУМАНИТ СПРЕЙ 400 мл |
| DOVE гель для душа ELEMENTS Свежесть минералов и шалфея 250 мл |
| Гель для душа DOVE 250 мл, в ассортименте |
| DOVE гель-скраб д/душа Нежное обновление 250 мл |
| DOVE Део-карандаш Elements Свежесть минералов и шалфея 50 мл |
| DOVE Део-карандаш M+C Прохладная свежесть 50 мл |
| Антиперспирант-карандаш DOVE Невидимый 40 мл |
| DOVE Део-карандаш Невидимый Нежность лепестков 6х40 мл |
| DOVE Део-карандаш Нежность пудры 40 мл |
| Антиперспирант-карандаш DOVE Оригинал 40 мл |
| Антиперспирант-карандаш DOVE Прикосновение природы жен. 40 мл |
| DOVE Антиперспирант-карандаш Экстразащита без белых следов 50 мл |
| Антиперспирант-карандаш DOVE Экстразащита и уход 50 мл |
| Антиперспирант DOVE 50 мл в ассортименте |
| Антиперспирант DOVE Экстразащита без белых следов муж. 50 мл |
| DOVE Део-аэрозоль Elements Свежесть минералов и шалфея 150 мл |
| Антиперспирант-аэрозоль DOVE Бережная забота 150 мл |
| Антиперспирант аэрозоль DOVE M+C Прохладная свежесть 150 мл |
| DOVE Део-аэрозоль Мягкость хлопка 150 мл |
| Антиперспирант аэрозоль DOVE жен. 150 мл, в ассортименте |
| Жидкое крем-мыло DOVE Красота и уход 250 мл |
| Жидкое крем-мыло DOVE Нежный шелк 250 мл |
| DOVE жидкое мыло REGULAR REFIL 500 мл |
| DOVE жидкое мыло-крем Прикосновение свежести 250 мл |
| Крем гель-душ DOVE 250 мл в ассортименте |
| DOVE крем д/лица и тела Объятия нежности Кокосовое молочко и лепестки жасмина 150 мл |
| DOVE крем д/рук Основной уход 12х75 мл |
| DOVE крем для рук Объятия нежности 75 мл |
| DOVE крем питательный 150 мл |
| DOVE крем питательный 75 мл |
| DOVE крем-мыло Гипоаллергенное для чувствительной кожи 100 г |
| DOVE крем-мыло 135 г в ассортименте |
| DOVE крем-мыло 100 г в ассортименте |
| Лосьон для тела DOVE Объятия нежности 250 мл |
| DOVE лосьон для тела 250 мл в ассортименте |
| DOVE Масло для душа Питательное 200 мл |
| Молочко для тела DOVE Увлажнение и питание 250 мл |
| DOVE Средство для интимной гигиены Intimo Neutral 250 мл |
| Жидкое конц-ое ср-во для стирки SAVEX 2IN1 COLOR 1.3 л в полимерной упаковке |
| Жидкое конц-ое ср-во для стирки SAVEX 2IN1 COLOR 2,6 л в полимерной упаковке |
| Жидкое конц-ое ср-во для стирки SAVEX 2IN1 COLOR BRIGHTNESS 1, 3 л в полимерной упаковке |
| Жидкое конц-ое ср-во для стирки SAVEX 2IN1 FRESH 1, 3 л в полимерной упаковке |
| Жидкое конц-ое ср-во для стирки SAVEX 2IN1 FRESH 2, 6 л в полимерной упаковке |
| Стиральный порошок SAVEX 2 в1 COLOR 0,3 кг в картонной упаковке |
| Стиральный порошок SAVEX 2 в1 COLOR 2,4 кг |
| Стиральный порошок SAVEX 2 в1 COLOR 2 кг в полимерной упаковке |
| Стиральный порошок SAVEX 2 в1 COLOR 4 кг в полимерной упаковке |
| Стиральный порошок SAVEX 2 в1 FRESH 0,3 кг в картонной упаковке |
| Стиральный порошок SAVEX 2 в1 FRESH 1,2 кг |
| Стиральный порошок SAVEX 2 в1 FRESH 1,5 кг |
| Стиральный порошок SAVEX 2 в1 FRESH 2,4 кг |
| Стиральный порошок SAVEX 2 в1 FRESH 2 кг в полимерной упаковке |
| Стиральный порошок SAVEX 2 в1 FRESH 4 кг в полимерной упаковке |

# «ЦЯГНІКІ ЗАСПЯВАЛІ...»

## Прысвячаецца працаўнікам Беларускай чыгункі



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1.** Счэплены з паравозам спецыяльны вагон, дзе знаходзяцца запасы вугалю і вады. **5.** Плады, якія апалі ад ветру. **7.** Дапаможны паравоз у хвасце поезда. **8.** ... Лынькоў. Імя вядомага беларускага пісьменніка, аўтара аповесці для дзяцей «Міколка-паравоз». **10.** Частка электрычнай машыны. **12.** «На ... адыходзіць кур'ерскі цягнік. // Святочна і людна на мінскім вакзале». З паэмы А. Вялюгіна «Арка ў Негарэлым». **15.** «... зближана гудуць — // Толькі не злучаюцца». З верша С. Гаўрусёва «Паравозныя гудкі». **16.** Рака ў Францыі. **17.** Дарагая тая хата, дзе любяць госця і ... (прык.). **18.** «Званок другі і зараз трэці, // І дрыгнуў ..., быццам чэрці // Яго сярдзіта скалынулі». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Па дарозе ў Вільню»). **20.** «Імчаць вагоны. // І ... імчаць, // Даверыўшыся машыністу». З верша А. Грачанікава «Рабочыя цягнікі». **22.** Традыцыйны японскі алкагольны напітак. **24.** ... зближае народы (прык.). **26.** «... Беларуская, // Трывожныя гудкі. // Тваe тугія шпалы — пявучыя радкі». З верша П. Панчанкі «Беларускай чыгунцы». **27.** Прыстасаванне для падняцця грузаў. **28.** Буйны дзённы матылёк.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.** Закрытая пляцоўка пасажырскага чыгуначнага вагона. **2.** «Качагара я любіла // Ля самай чыгункі. // За ... тыдні не адмыла // Яго пацалункі». Прыпеўка. **3.** Асобнае памяшканне ў пасажырскім вагоне. **4.** «Жыццё ў ... падарожжа — гэта мара ў чыстым выглядзе». А. Крысці. **6.** ... звілістая — ісціна прамая (прык.). **9.** «Ідуць у брусніцы // Дзеўкі, маладзіцы, // А Міхася цягне // Бор і ...». З паэмы Я. Коласа «Міхасёвы прыгоды» («Грыбы»). **11.** «Цягнік спяшаўся, сакатаў маркотна, // Цягнік сумленна мераў ...». З верша У. Дубоўкі «Цягнік спяшаўся». **13.** Тканка, якая запаўняе поласць зуба. **14.** Тое, што і латы. **17.** «Самы верны ... даведацца, падабаецца табе чалавек ці не, — гэта паехаць з ім падарожнічаць». М. Твэн. **19.** Тое, што адурманьвае, ап'яняе. **21.** Бахчавая расліна. **23.** «Цягнікі заспявалі, заплакалі, // ... змяшалі з па-рай лагчын». З верша У. Караткевіча «Цягнікі заспявалі». **25.** «Дзынкне буфер аб буфер. // Абстуканы буксы, рэсоры. // З верша М. Лужаніна «... таварных цягнікоў».

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**Праверце, калі ласка, адказы:**

**Па гарызанталі: 1.** Тэндар. **5.** Апад. **7.** Штурхач. **8.** Міхась. **10.** Якар. **12.** Брэст. **15.** Рэйкі. **16.** Луара. **17.** Свята. **18.** Поезд. **20.** Людзі. **22.** Саке. **24.** Турызм. **26.** Чыгунка. **27.** Блок. **28.** Махаон.

**Па вертыкалі: 1.** Тамбур. **2.** Два. **3.** Купэ. **4.** Час. **6.** Дарога. **9.** Хваінячок. **11.** Кіламетры. **13.** Пульпа. **14.** Кіраса. **17.** Спосаб. **19.** Дурман. **21.** Дыня. **23.** Дым. **25.** Рух.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.28 | 21.02 | 15.34 |
| Віцебск — | 5.12 | 20.57 | 15.45 |
| Магілёў — | 5.18 | 20.52 | 15.34 |
| Гомель — | 5.21 | 20.43 | 15.22 |
| Гродна — | 5.44 | 21.16 | 15.32 |
| Брэст — | 5.51 | 21.11 | 15.20 |

## Месяц

*Апошняя квадра ў 21.18*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

## Імяніны

***Пр.** Марыі, Магдаліны, Аляксея, Карнілы, Міхаіла, Фокі.*
***К.** Дамініка, Пратаза, Яна.*



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

# ЗАЎТРА




## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +25..+27°С | КІЕЎ +26..+28°С | РЫГА +22..+24°С |
| ВІЛЬНЮС +24..+26°С | МАСКВА +25..+27°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +22..+24°С |

Даты | Падзеі | Людзі

**4 ЖНІЎНЯ**

У краіне

**1772** год — ажыццёўлены першы падзел Рэчы Паспалітай. У выніку яго Расія далучыла Ліфляндскае, большую частку Полацкага (на правым беразе Дзвіны), амаль усё Віцебскае, Мсціслаўскае ваяводствы, усходнюю частку Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства з гарадамі Полацк, Віцебск, Магілёў, Орша, Прапойск, Мсціслаў, Рагачоў, Гомель, Чачэрск і іншымі. Аўстрыя захапіла заходнюю частку Украіны са Львовам і паўднёвую частку Польшчы; Прусія — паўночна-заходнюю частку Польшчы.

**1838** год — нарадзіўся (г. Валожын) Юзаф Беркман, беларускі жывапісец. Вучыўся жывапісу ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. За ўдзел у паўстанні 1863—1864 гадоў быў сасланы ў Сібір, дзе і жыў пасля адбыцця катаргі. Творы пераважна на тэмы паўстання і жыцця ссыльных паўстанцаў («Смерць Нарбута»). Памёр у 1919 годзе.

**1905** год — нарадзіўся (в. Зазер'е, цяпер у Пухавіцкім раёне) Аляксандр Вікенцьевіч Аўгустайціс, беларускі камсамольскі дзеяч. З 1929 года быў сакратаром Плешчаніцкага райкама ЛКСМБ, з 1931-га — прадстаўніком ЦК ЛКСМБ у Трактарацэнтры БССР, затым сакратар, з 1934 года — першы сакратар ЦК ЛКСМБ. У 1937 годзе рэпрэсаваны і расстраляны. Рэабілітаваны ў 1956-м.

**1907** год — нарадзіўся (г. Санкт-Пецярбург) Эдуард Самуйлёнак, беларускі пісьменнік. Аўтар кніг «Пункт апоры», «Паляўнічае шчасце», «Дачка эскадрона», рамана «Будучыня», п'есы «Пагібель воўка» і іншых. Асноўная тэма творчасці Э. Самуйлёнка — рэвалюцыйныя традыцыі і заканамернасці іх развіцця ў практыцы сацыялістычнага будаўніцтва. Для твораў аўтара характэрныя элементы прыгодніцтва. Памёр у 1939 годзе.



**1917** год — нарадзіўся Янка Брыль, народны пісьменнік Беларусі, ганаровы член НАН Беларусі. Друкавацца пачаў у 1938 годзе. Аўтар аповесцяў «У Забалоцці днее», «Золак, убачаны здалёк», рамана «Птушкі і гнёзды». Адзін з аўтараў кнігі «Я з вогненнай вёскі...». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1952), Літаратурнай прэміі імя Я. Коласа (1963), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1982). Памёр у 2006 годзе.

**1945** год — у вёсцы Вязынка Маладзечанскага раёна ў доме, дзе нарадзіўся Янка Купала, заснаваны філіял Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы «Вязынка». Адкрыты для наведвальнікаў у чэрвені 1948-га.

У свеце

**1905** год — нарадзіўся Барыс Аляксандравіч Аляксандраў (1905—1994), савецкі і расійскі кампазітар, хормейстар, дырыжор, народны артыст СССР, Герой Сацыялістычнай Працы. У 1946—1986 гадах — мастацкі кіраўнік Ансамбля песні і танца Савецкай Арміі. Аўтар шэрагу хораў «Песня перамогі», «Няхай жыве наша дзяржава», аперэт «Вяселле ў Малінаўцы», «Мая Гюзель» і іншых.

**1915** год — пасля паражэнняў на франтах Першай сусветнай вайны часці расійскай арміі пакінулі тэрыторыю Польшчы. Завяршылася амаль стагадовае панаванне расійскага прастола ў Варшаве і Каралеўстве Польскім. 5 жніўня Варшава была акупіравана германскімі войскамі.

## УСМІХНЕМСЯ

**Навукоўцы даказалі, што можна ўсё ж такі вылецець з любога аэрапорта свету, не абвяшчаючы пра гэта ў сацыяльных сетках.**

— Доктар, а які ідэальны рост пры маёй вазе?
— Чатыры метры.

**Мужыкі, не будзьце дурнямі.**

**Калі ваша жонка адчыняе вам дзверы і пры гэтым па-дурному ўсміхаецца, значыць, яна зрабіла новую стрыжку. Звярніце ўвагу і пахваліце.**

— Сволач ты! Усё жыццё мне сапсаваў, усю маладосць на цябе змарнавала!
— Дачушка, хопіць размаўляць з дыпломам.

**Я паверу ў глабальнае пацяпленне праз сто гадоў, калі ўбачу два дакладныя прагнозы надвор'я на выхадныя запар.**

— Абнімі мяне!
— Не, я токам б'юся.
— А я швабрай. Абдымай, кажу!




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета адрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2857.
Нумар падпісаны ў 19.30 3 жніўня 2018 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12